Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся·

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

8 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варачаюцца.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к.; „ 3 „ — 2 р. — к.; „ 6 „ — 4 р. — к.; „ 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагароднія—20 к., мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нонпарэлі насярод тэксту 1 р. — к. За радок нонпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 277 (2169) Серада, 7-га сьнежня 1927 г.

XV ЗЬЕЗД УсеКП(б).

Палітычная справаздача Цэнтральнага Камітэту.

Даклад тав. Сталіна.

ВЫНІКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І УНУТРАНАЕ СТАНОВІШЧА.

Савецкі Саюз шпаркім крокам ідзе да сацыялізму.

Аграмаджаны сэктар гаспадаркі і гандлю з кожным годам усё больш выціскае прыватны капітал з яго пазіцый. За апошнія 2 гады прыватнакапіталістычны зварот у народнай гаспадарцы краю падае ня толькі адносна, але і абсалютна.

Зараз задача—узяць напрамак на калектывізацыю сельскае гаспадаркі. Савецкая ўлада моцная, як ніводная ўлада ў сьвеце.

У барацьбе з апазіцыяй партыя загартавала сябе, як сіла, здольная даць адпор нажыму дробнабуржуазнае стыхіі на свае рады. Калі апазіцыя хоча заставацца ў ленінскай партыі, дык яна павінна перад усім сьветам прызнаць і адмовіцца раз назаўсёды ад наробленых ёю памылак.

I. Дасягненьні ў галіне гаспадарчага будаўніцтва.

14-ты зьезд нашае партыі даручыў Цэнтральнаму Камітэту весьці справу разьвіцьця народнае гаспадаркі з пункту гледжаньня асноўных задач: **папершае**, каб палітыка нашая дапамагала паступоваму росту вытворчасьці ўсяе народнае гаспадаркі ў цэлым; **падругое**, каб палітыка партыі дапамагала паскоранаму тэмпу разьвіцьця індустрыі і забясьпечаньня за індустрыяй кіруючае ролі ва ўсёй народнай гаспадарцы; **патрэцяе**, каб у ходзе разьвіцьця народнае гаспадаркі забясьпечвалася ўсё больш узрастаючая ўдзельная вага сацыялістычнага сэктару народнае гаспадаркі, сацыялістычных формаў гаспадаркі, за кошт прыватна-таварнага і капіталістычнага сэктару; **пачацьвёртае**, каб наш край не ператвараўся ў дадатак да капіталістычнае сыстэмы сусьветнае гаспадаркі; **папятае**, каб дыктатура пралетарыяту, блёк рабочае клясы і сялянскіх мас і кіраўніцтва рабочае клясы ў гэтым блёку ўмацоўваліся і, **пашостае**, каб матар'яльнае і культурнае становішча рабочае клясы і вясковае беднаты няўхільна павышалася. Што зроблена ў галіне выкананьня гэтых задач нашай партыяй, Цэнтральным Камітэтам нашае партыі за справаздачны пэрыяд?

Ідзём наперад шпаркім тэмпам.

Першае пытаньне—разьвіцьцё народнае гаспадаркі ў цэлым.

Грунтуючыся на кантрольных лічбах Дзяржпляну на 1927-28 г. і на чарнавой наметцы 5-цігадовага пляну, Сталін зазначае, што ў 1924-25 г. валавая прадукцыя сельскае гаспадаркі складала, водлуг новых разрахункаў Дзяржпляну, 87,3 проц. ад даваеннага, а прадукцыя ўсяе прамысловасьці 63,7 проц. ад даваеннае. У 1926-27 г. прадукцыя сельскае гаспадаркі складае ўжо 108,3 проц., а прадукцыя прамысловасьці—100,9 проц.

Водлуг кантрольных лічбаў Дзяржпляну на 1927-28 г. прадугледжваецца далейшае павялічэньне прадукцыі сельскае гаспадаркі да 111,8 проц. ад даваеннае, а прамысловасьці—да 114,4 проц. Калі ўзяць разьмеры гандлёва-пасярэдніцкага звароту 1924-25 г. за 100 (14.613 мільёнаў чырвоных рублёў), дык у 1926-27 г. мы маем павялічэньне на 97 проц. (28,775 мільёнаў руб.) а ў 1927-28 г. прадугледжваецца далейшы рост да 116 пр. (33.440 мільёнаў руб.).

Калі ўзяць сводныя балянсы ўсіх нашых крэдытных устаноў на 1 кастрычніка 1925 г. за 100 (5.343 мільёны чырв. руб.), дык на 1 ліпеня 1927 г. мы маем рост на 53 пр. (8.175 міл. руб.). Няма падстаў сумнявацца ў тым, што 1927-28 год дасьць далейшы рост нашае рацыяналізаванае крэдытнае сыстэмы.

За 1924-25 г. мы мелі грузазвароту па ўсёй нашай чыгуначнай сетцы 63,1 проц. даваеннага, а ў 1926-27 г. мы маем 99,1 проц., а ў 1927-28 г. будзем мець 111,6 проц.

Чыгуначная сетка за гэтыя два гады павялічылася ад 74,4 тысячы кілёмэтраў да 76,2 тысяч кілёмэтраў, што складае павялічэньне проці даваеннага ўзроўню на 30,3 проц., а проці 1917 г.—на 8,9 проц.

Сводны бюджэт (адзіны дзяржаўны бюджэт плюс мясцовыя бюджэты) складаў у нас на 1925-26 г. 72,4 проц. даваеннага (5.024 міл. руб.), а на 1927-28 г. ён павінен скласьці 110-112 проц. ад даваеннага (больш 7 міліардаў руб.). **Прырост за два гады 41,5 проц.**

Агульны зварот замежнага гандлю ў 1924-25 г. складаў 1282 мільёны р., г. зн. каля 27 проц. ад даваеннага. У 1926-27 г. мы маем зварот на 1.483 мільёны руб., г. зн. 35,6 проц. ад даваеннага, а ў 27-28 г. прадугледжваецца мець 1.682 мільёны руб., г. зн. 37,9 проц. ад даваеннага. Прычыны затрыманьня тэмпу разьвіцьця замежнага гандлю: паперашае ў тым, што буржуазныя дзяржавы даволі часта перашкаджаюць нашаму замежнаму гандлю, наладжваючы іншы раз і прыкрытую блёкаду; потым у тым, што мы ня можам гандляваць па буржуазнай формуле: «самі не даямо, а вывозіць будзем». Плюсам тут зьяўляецца актыўнае сальдо па Народным Камісарыяце Замежнага Гандлю за 1926-27 г. у суме 57 мільёнаў руб. Гэта першы год пасьля 1923-24 г., калі балянс замежнага гандлю падсумоўваецца з плюсам.

У выніку мы маем наступны калюнак агульнага росту ўсяго нацыянальнага прыбытку за гэтыя два гады: калі лічыць, што ў 1924-25 г. нацыянальны прыбытак СССР складаў 15.589 міліёнаў чырвоных рублёў, дык у 1925-26 г. мы мелі 20.252 міліёны руб., г. зн. прырост за год на 29,9 проц., а ў 1926-27 г.—22.560 міліёнаў руб. г. зн. прырост за год на 11,4 проц. Водлуг кантрольных лічбаў Дзяржпляну ў 1927-28 г. мы будзем мець 24.208 міліёнаў руб., г. зн. прырост на 7,3 проц. Калі ўзяць пад увагу, што сярэдні штогодны прырост нацыянальнага прыбытку Злучаных Штатаў не перавышае 3-4 проц. (толькі адзін раз у 80 гадох мінулага веку Злучаныя Штаты мелі каля 7 проц. прыросту нацыянальнага прыбытку), а штогодны прырост нацыянальнага прыбытку іншых краёў, напрыклад Англіі і Нямеччыны, не перавышае 1-3 пр., дык трэба прызнаць, што тэмп росту нацыянальнага прыбытку СССР за апошнія гады зьяўляецца рэкордным у параўнаньні з буйнымі капіталістычнымі краямі Эўропы і Амэрыкі.

ВЫВАД: народная гаспадарка нашага краю расьце шпаркім тэмпам.

ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ: пасоўваць далей разьвіцьцё народнае гаспадаркі па ўсіх галінах вытворчасьці.

Наш край індустрыялізуецца.

Рост народнае гаспадаркі, гаворыць т. Сталін, ідзе ў нас не ў сьляпую, не ў парадку простага колькаснага росту прадукцыі, а ў сурова вызначаным напрамку. Рашаючым фактарам у справе разьвіцьця народнае гаспадаркі за апошнія два гады зьяўляюцца дзьве асноўныя прычыны. **Паперашае**, разьвіцьцё нашае народнае гаспадаркі ідзе пад знакам індустрыялізацыі краю, пад знакам узрастаючае ролі прамысловасьці ў адносінах сельскае гаспадаркі. **Падругое**, разьвіцьцё народнае гаспадаркі, індустрыялізацыя краю прахозіць у напрамку павялічэньня ўдзельнае вагі і кіруючае ролі сацыялістычных формаў гаспадаркі як у галіне вытворчасьці, так і ў галіне тавара-звароту, за кошт прыватна-таварнага і капіталістычнага сэктараў. Доля валавае прадукцыі прамысловасьці ў адносінах да ўсяе прадукцыі народнае гаспадаркі ў 1924-25 г. складала па даваенных цэнах 32,4 проц., а доля сельскае гаспадаркі—67,6 проц. У 1926-27 г. доля прамысловасьці павялічылася да 38 пр., пры зьмяншэньні долі сельскае гаспадаркі да 62 проц. У 1927-28 г. доля прамысловасьці павінна ўзрасьці да 40,2 пр., а доля сельскае гаспадаркі павінна зьменшыцца да 59,8 проц.

Лічбы аб росьце ўдзельнае вагі вырабу машын і сродкаў вытворчасьці, якія зьяўляецца асноўным стрыжанём індустрыі, у адносінах да ўсяе прамысловасьці за гэтыя два гады наступныя: у 1924-25 г. доля вырабу сродкаў вытворчасьці—34,1 пр., у 1926-27 годзе—37,6 пр., а ў 1927-28 г. прадугледжваецца давесьці да 38,6 проц. Лічбы аб росьце ўдзельнае вагі вырабу сродкаў вытворчасьці і дзяржаўнае буйнае прамысловасьці за два гады: у 1924-25 г.—42 пр., у 1926-27 г.—44 пр., а ў 1927-28 г. прадугледжваецца павялічыць да 44,9 проц.

Што датычыцца таварнае прадукцыі прамысловасьці і яе ўдзельнае вагі ва ўсёй масе тавараў, дык доля прамысловасьці вырасла за гэтыя два гады ад 53,1 пр. у 1924-25 г. і да 59 з паловай проц. у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. яна павінна дасягнуць 60,7 пр. у той час, як частка таварнае прадукцыі сельскае гаспадаркі складала ў 1924-25 г. 46,9 %, у 1926-27 г. зьменшылася да 40 ½ %, а ў 1927-28 г. павінна зьменшыцца да 39,3 проц.

ВЫВАД: край наш ператвараецца ў індустрыяльны край.

ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ: пасоўваць далей усімі мерамі індустрыялізацыю нашага краю.

Перамога сацыялістычных элемэнтаў гаспадаркі.

У той час, як капітальныя ўклады ў аграмаджаны сэктар народнае гаспадаркі (дзяржаўная і каапэрацыйная прамысловасьць, транспарт, электрыфікацыя і г. д.) вырасьлі ад 1.231 міліёну руб. у 1924-25 г. да 2.683 міліёны руб. у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. уклады павінны дасягнуць да 3.456 міліёнаў руб., што складае рост **укладаў 43,8 проц. у 1924-25 г. да 65,3 проц. у 1927-28 г.**—Уклады ў неаграмаджаны сэктар народнае гаспадаркі ўвесь час зьмяншаліся адносна і расьлі толькі нязначна і ў абсалютных лічбах з 1.577 міліёнаў у 1924-25 г. да 1.717 міліёнаў у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. яны павінны дасягнуць да 1.836 міліёнаў р., што дае зьмяншэньне ўдзельнае вагі ўкладаў неаграмаджанага сэктару ад 56,2 проц. у 1924-25 г. да 34,4 пр. у 1927-28 г.

У той час, як валавая прадукцыя аграмаджанага сэктару прамысловасьці вырасла з 81 проц. у 1924-25 г. да 86 проц. усяе прамысловасьці ў 1926-27 г., а ў 1927-28 г. павінна павялічыцца да 86,9 проц.—роля неаграмаджанага сэктару прамысловасьці зьмяншалася з году ў год (ад 19 проц. прадукцыі ўсяе прамысловасьці ў 1924-25 г. да 14 проц. у 1926-27 г., а ў 1927-28 г. павінны зьменшыцца да 13,1 проц.).

Што датычыць ролі прыватнага капіталу ў буйнай (цэнзавай) прамысловасьці, дык яна зьмяншаецца ня толькі адносна (3,9 проц. у 1924-25 г. і 2,4 проц. у 1926-27 г.), але і абсалютна (169 міліёнаў даваенных руб. у 1924-25 г. і 165 міліёнаў даваенных руб. у 1926-27 г.). Такое-ж адсоўваньне прыватна-капіталістычных элемэнтаў наглядаем мы і ў галіне тавара-звароту краю. У той час, як частка аграмаджанага сэктару ва ўсім пасрэдніцкім звароце складала ў 1924-25 г. 72,6 проц., у аптовым 90.6 проц., а ў розьніцы 57,3 проц., у 1926-27 г. удзельная вага аграмаджанага сэктару павялічылася ў сваім звароце на 181,9 проц., у аптовым да 194,9 пр., у розьніцы да 67,4 проц., у той час як доля прыватнага сэктару зьменшылася за гэты час з 27,4 проц. ва ўсім гандлёва-пасрэдніцкім звароце да 18,1 проц. (у аптовым—ад 9,4 проц. да 5,1 проц., у розьніцы ад 42 да 32,6 проц.), прычым у 1927-28 г. прадугледжваецца далейшае зьмяншэньне ўдзельнае вагі прыватнага сэктару па ўсіх відах гандлю.

ВЫВАД: край наш ідзе да сацыялізму ўпэўнена і хутка, адсоўваючы на другі плян і выціскаючы крок за кронам з народнае гаспадаркі капіталістычныя элемэнты. Гэты факт выкрывае перад намі аснову пытаньня: хто каго? Цяпер мы можам сказаць, што ў асноўным мы ў гэтай галіне маем ужо рашаючыя посьпехі. Адхіляць гэта могуць толькі сьляпыя, ці бязглуздыя.

Але цяпер пытаньне—«хто каго» пераносіцца з галіны гандлю ў галіну вытворчасьці, у галіну вытворчасьці саматужнае, у галіну вытворчасьці сельска-гаспадарчае, дзе прыватны капітал мае сваю вядомую ўдзельную вагу і адкуль яго трэба сыстэматычна выціскаць.

ЗАДАЧА ПАРТЫІ: пашыраць і ўмацоўваць нашыя сацыялістычныя камандныя ўзвышшы ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі як у горадзе, так і на вёсцы, трымаючы курс на ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў у народнай гаспадарцы.

Навука міжнароднаму пралетарыяту.

Калі ўзяць валавую прадукцыю ўсяе прамысловасьці краю, і буйнае (дзяржаўнае і прыватнае), і дробнае,—гаворыць далей Сталін,—дык штогодны сярэдня-арытмэтычны прырост прадукцыі водлуг пяцігадовае наметкі Дзяржпляну складзе каля 12 проц., што дасьць павялічэньне ўсяе прамысловае прадукцыі ў 1931-32 г. амаль на 70 проц. у параўнаньні з даваенным узроўнем. Процант штогодняга прыросту прадукцыі нашае сацыялістычнае прамысловасьці, а таксама прадукцыі ўсяе прамысловасьці ёсьць рэкордны процант, якога ня мае ніводзін буйны капіталістычны край у сьвеце. Па тэмпу свайго разьвіцьця нашая прамысловасьць наогул, **нашая сацыялістычная прамысловасьць асабліва абганяе разьвіцьцё прамысловасьці капіталістычных краёў.** Гэты нячуваны тэмп разьвіцьця нашае буйнае прамысловасьці тлумачыцца, **паперашае**, тым, што яна ёсьць прамысловасьць нацыяналізаваная; **падругое**, тым, што яна ёсьць самая буйная і самая канцэнтраваная прамысловасьць з усіх існуючых прамысловасьцяў у сьвеце; **патрэцяе**, тым, што нашая дзяржава трымае ў сваіх руках нацыяналізаваны транспарт, нацыяналізаваны крэдыт, нацыяналізаваны замежны гандаль, агульны дзяржаўны бюджэт мае ўсе магчымасьці кіраваць нацыяналізаванаю прамысловасьцю ў плянавым парадку, як адзінаю прамысловаю гаспадаркаю; **пачацьвертае**, тым што нацыяналізаваная прамысловасьць, як самая буйная і самая магутная прамысловасьць, мае ўсе магчымасьці праводзіць тактыку няўхільнага зьмяншэньня сабекошту, зьмяншэньня адпускных цэн і патаньня сваёй прадукцыі; **папятае**, тым, што нацыяналізаваная прамысловасьць можа разьвівацца ў абставінах наступовага зьбліжэньня між горадам і вёскаю ў процівагу капіталістычнай прамысловасьці, якая разьвіваецца ва ўмовах нарастаючае варожасьці між буржуазным горадам, які высмоктвае сокі ў сялянства, і паступова бяднеючаю вёскаю; **урэшце** тым, што нацыяналізаваная прамысловасьць абапіраецца на рабочую клясу, як на гегемона ўсяго нашага разьвіцьця, з прычыны чаго яна мае магчымасьць з большаю лёгкасьцю разьвіваць тэхніку наогул, прадукцыйнасьць працы, асабліва рацыяналізаваць вытворчасьць і кіраўніцтва пры падтрыманьні з боку шырокіх мас рабочае клясы, чаго няма і ня можа быць пры капіталістычнай сыстэме прамысловасьці.

Нячуваны тэмп разьвіцьця нашае сацыялістычнае прамысловасьці ёсьць **просты і бязумоўны доказ перавагі савецкае сыстэмы вытворчасьці перад сыстэмаю капіталістычнаю.**

ЗАДАЧА ПАРТЫІ: замацаваць дасягнуты тэмп разьвіцьця сацыялістычнае прамысловасьці і ўзмацніць яго ў бліжэйшай будучыне для стварэньня больш спрыяючых умоў, неабходных для таго, каб дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краі.

Адставаньне с.-г. сэктару нар. гаспадаркі

У вёсцы, наадварот, мы маем параўнаўча павольны рост прадукцыі. Калі ў 1925-26 г. прырост валавае прадукцыі (у даваенных рублёх) у параўнаньні з папярэднім годам складаў 9 проц., у 1926-27 г.—4,1 проц., у 1927-28 г. складае 3,2 проц., дык водлуг чарнавое і значна зьменшанае 5-цігадовае наметкі Дзяржпляну, прырост прадукцыі за пяць гадоў складзе ўсяго 24 проц. з сярэдня-арытмэтычным штогодным прыростам прадукцыі ў 4,8 проц. і з павялічэньнем сельска-гаспадарчае прадукцыі ў 1931-32 г. на 28-30 проц. у параўнаньні з даваеннаю прадукцыяй. Гэта ёсьць больш-менш здавальняючы штогодні прырост сельска-гаспадарчае прадукцыі. Але яго ніяк нельга назваць ні рэкордным, ні ў параўнаньні з капіталістычнымі краямі, ні здавальняючым для таго, каб захаваць у будучыне неабходную роўнавагу між сельскаю гаспадаркаю і нашаю нацыяналізаванаю прамысловасьцю. Такі параўнаўча павольны тэмп разьвіцьця сельскае гаспадаркі ў параўнаньні з тэмпам разьвіцьця нашае нацыяналізаванае прамысловасьці тлумачыцца як празьмерною адсталасьцю нашае сельска-гаспадарчае тэхнікі і вельмі нізкім узроўнем культурнага становішча вёскі, так і асабліва тым, што нашая сельска-гаспадарчая вытворчасьць не нацыяналізавана і не аб'яднана, а распылена і раскідана па кавалках, не вядзецца ў плянавым парадку і падпачалена пакуль-што ў вялікай сваёй частцы стыхіі дробнае вытворчасьці; не аб'яднана і ня ўзбуйнена па лініі калектывізацыі і таму ўяўляе яшчэ вельмі выгоднае поле для эксплёатацыі з боку кулацкіх элемэнтаў.

Дзе-ж выхад для сельскае гаспадаркі? Можа ў прыпыненым тэмпе разьвіцьця нашае прамысловасьці наогул, нашае нацыяналізаванае прамысловасьці, між іншым? Не, ні ў якім выпадку. Гэта было-б найбольш рэакцыйнаю мераю, анты-пралетарскаю утопіяю (галасы: правільна). Нацыяналізаваная прамысловасьць павінна і будзе разьвівацца прысьпешаным тэмпам. У гэтым гарантыя нашага пасоўваньня да сацыялізму. У гэтым гарантыя таго, што будзе, урэшце, індустрыялізавана сельская гаспадарка.

Напрамак на калектывізацыю с. гасп.

Дзе-ж выхад? Выхад у тым, каб **дробныя і найдрабнейшыя сялянскія гаспадаркі** паступова, але няўхільна, не ў парадку націску, а ў парадку перакананьня, **аб'яднаць у буйныя гаспадаркі на падставе грамадзкае, таварыскае, калектыўнае апрацоўкі зямлі**, з ужываньнем сельска-гаспадарчых машын і трактараў, з ужываньнем навучальных спосабаў інтэнсыфікацыі земляробства. Партыя ў гэтым напрамку за два гады зрабіла ня мала, але далёка яшчэ ня ўсё, што можна было-б зрабіць.

Што датычыць ахопу вузкае гаспадаркі, так сказаць знадворку, па лініі дастаўкі сельскай гаспадарцы неабходных вырабаў у абмен на збыт с.-г. прадуктаў, мы маем наступныя дасягненьні: сельска-гаспадарчая каапэрацыя яднае зараз каля аднае трэці ўсіх сялянскіх двароў. Спажывецкая каапэрацыя павялічыла ахоп дастаўкі вёсцы ад 25,6 проц. у 1924-25 г. да 50,8 проц. у 26-27 г.; каапэрацыйныя і дзяржаўныя органы павялічылі ахоп збыту сельска-гаспадарчае прадукцыі ад 55,7 проц. у 24-25 г. да 63 проц. у 26-27 г.

Што-ж датычыць ахопу сельскай гаспадаркі, так сказаць з унутранага боку па лініі с. г. вытворчасьці, дык у гэтай галіне ў нас зроблена вельмі мала. Досыць сказаць, што калектыўныя гаспадаркі і савецкія гаспадаркі даюць зараз усяго звыш 2 проц. і ў сельска-гаспадарчай прадукцыі і 7 з паловаю проц. таварнае прадукцыі. Прычын тут, зразумела, ня мала, і аб'ектыўных і суб'ектыўных. Няўмелы падыход да справы, нявыстарчальная ўвага гэтай справе з боку нашых працаўнікоў, кансэрватыўнасьць і адсталасьць сялян, недахоп сродкаў, неабходных для справы пераводу сялян на грамадзкую апрацоўку зямлі і г. д. А сродкі патрэбны не малыя. Ленін гаварыў на 10-м зьезьдзе, што ў нас няма яшчэ фондаў, неабходных для падпарадкаваньня сельскай гаспадаркі дзяржаўнаму ці калектыўнаму пачатку. Я думаю, што гэтыя фонды будуць узрастаць з працягам часу.

Як прыклад, як савгасы дапамагаюць часамі сялянам перайсьці на калектыўную апрацоўку зямлі да вялікай выгады для сялян, Сталін зазначае на дапамогу аб'яднаньня украінскіх савгасаў трактарамі сялянам Адэскага раёну, і чытае надрукаваны ня даўна ў № 267 «Известий» ліст гэтых сялян з падзякаю за аказаную дапамогу. Больш бы гэткіх прыкладаў,—гаворыць Сталін,—і тады можна было-б пасунуць гэтую справу далёка наперад.

Задача партыі: пашыраць ахоп сялянскае гаспадаркі каапэрацыяй і дзяржаўнымі органамі па лініі збыту і дастаўкі і паставіць чарговаю практычнаю задачаю нашага будаўніцтва ў вёсцы паступовы перавод распыленых сялянскіх гаспадарак на рэйкі аб'яднаных, буйнейшых гаспадарак, на калектыўную апрацоўку зямлі на падставе інтэнсыфікацыі і машынізацыі, у разрахунку, што гэткі шлях разьвіцьця зьяўляецца найважнейшым сродкам прысьпешаньня тэмпу разьвіцьця сельскае гаспадаркі і перамогі над капіталістычнымі элемэнтамі ў вёсцы.

Ценявыя бакі нашае гаспадаркі.

Гэта ня значыць, што ў нас у гэтай галіне ўсё добра. Не, у нас далёка ня ўсё добра.

У нас ёсьць, напрыклад, элемэнты таварнага голаду. Гэта—мінус у нашай гаспадарцы. Але мінус пакуль яшчэ, нажаль, немінучы. Нашая апазіцыя чэрпае матар'ялы для сваёй ідэалёгіі ў спэкулянцкіх чаргох і крычыць аб таварным голадзе, патрабуючы разам з тым «звыш'індустрыялізацыі». Але гэта бязглуздзіца, таварышы. Так могуць гаварыць толькі нязнайкі. Мы ня можам і не павінны скарачаць цяжкую індустрыю для ўсямернага разьвіцьця лёгкае прамысловасьці. Ды і лёгкую прамысловасьць немагчыма разьвіваць у неабходнай меры бяз прысьпешанага разьвіцьця цяжкае індустрыі. Можна было-б павялічыць увоз гатовых тавараў і спыніць такім чынам таварны голад, чаго калісь дамагалася апазіцыя. Але гэта такое глупства, ад якога павінна была адмовіцца і апазіцыя. Іншае пытаньне,—наколькі ўмела вядзецца ў нас справа зьнішчэньня элемэнтаў таварнага голаду, што зусім магчыма ў нашых умовах і на чым заўсёды спынялася партыя. Я думаю, што іменна ў гэтай галіне ў нас становішча ня зусім добрае.

Далей, мы маем гэткі факт, як параўнаўча не малая колькасьць капіталістаў як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне гандлю. Удзельная вага гэтых элемэнтаў не такая малая, як гэта часамі стараюцца ў нас давесьці некаторыя таварышы. Гэта таксама мінус у балянсе нашае гаспадаркі. Ці ўсё робіцца, каб абмежаваць, зьменшыць і выціснуць урэшце з сфэры народнае гаспадаркі капіталістычныя элемэнты? Я думаю, што ня ўсё. Я ведаю, напрыклад, што ў галіне саматужнае прамысловасьці наогул і ў галіне скуранае і тэкстыльнае прамысловасьці ёсьць не малая колькасьць новых міліянэраў якія закабаляюць сабе саматужнікаў і наогул дробных вытворцаў. Ці ўсё робіцца, каб абкружыць і выціснуць эканамічна гэтыя эксплёататарскія элемэнты і каб наладзіць сувязь саматужнікаў з каапэрацыяю або з дзяржаўнымі органамі? Відаць, што далёка ня ўсё робіцца ў гэтай галіне. А, між тым, гэтае пытаньне мае для нас сур'ёзнае значэньне.

Мы маем пэўны рост кулацтва ў вёсцы. Гэта мінус у балянсе нашае гаспадаркі. Ці ўсё робіцца, каб абмежаваць і эканамічна ізаляваць кулацтва? Я думаю, што ня ўсё. Не правы тыя таварышы, якія думаюць, што можна і трэба зьнішчыць кулака адміністрацыйнымі мерамі, праз ДПУ—сказаў, прыклаў пячатку і канец. Гэты сродак лёгкі, але ня пэўны. Кулака трэба ўзяць мерамі эканамічнага парадку, на падставе рэвалюцыйнае законнасьці. А рэвалюцыйная законнасьць ня ёсьць пустыя словы. Гэта, зразумела, не выключае ўжываньня некаторых неабходных адміністрацыйных мер проці кулака.

Мы маем, далей гэткі факт, як надзвычайна павольны тэмп зьніжэньня сабекошту ў прамысловасьці, адпускных цэн на прамысловыя тавары і, асабліва, розьнічных цэн на гарадзкія тавары. Гэта таксама мінус у балянсе нашага гаспадарчага будаўніцтва. Нельга не адзначыць, што мы маем тут вялізарнае супярэчаньне апарату і дзяржаўнага, і каапэрацыйнага, і партыйнага. Нашыя таварышы, відаць, не разумеюць, што палітыка зьніжэньня цэн на прамтавары зьяўляецца адным з асноўных рычагоў палепшаньня нашае прамысловасьці, пашырэньня рынку і ўзмацненьня тае крыніцы, на базе якое толькі і можа разгортвацца нашая індустрыя. Можна быць упэўненым, што толькі шляхам няшчаднае барацьбы з гэтаю індыфэрэнтнасьцю апарату, з гэтым супярэчаньнем апарату ў справе правядзеньня палітыкі зьніжэньня цэн можна будзе зьліквідаваць гэты мінус.

Урэшце, мы маем гэткія мінусы, як гарэлка ў бюджэце, вельмі павольныя тэмпы разьвіцьця замежнага гандлю і недахват рэзэрваў. Я думаю, што можна было-б пачаць паступова зьмяншаць выраб гарэлкі, узяўшы ў справу замест гарэлкі гэткія крыніцы прыбытку, як радыё і кіно. Што-ж датычыць замежнага гандлю, дык мне здаецца, што тыя цяжкасьці, якія мы маем у галіне гаспадаркі, упіраюцца ў слабасьць экспорту. Ці ўсё робіцца, каб павялічыць экспорт? Я думаю, што ня ўсё. Тое самае трэба сказаць аб рэзэрвах. Усе органы нашае дзяржавы, ад павятовых і губэрскіх, да абласных і цэнтральных, стараюцца што-небудзь схаваць у рэзэрв на чорны дзень. Але гэтых рэзэрваў мала. Таму зьяўляецца задача, як мага павялічыць рэзэрвы, нават часамі за кошт скарачэньня некаторых бягучых патрэб.

Вось якія ценявыя бакі нашага гаспадарчага будаўніцтва, якім неабходна надаць увагу і якія абавязкова трэба зьнішчыць.

II. Унутранае палітычнае становішча.

Рост матар'яльнага дабрабыту рабочае клясы.

Асоб наёмнае працы (акрамя беспрацоўных) было ў 1924-25 годзе 8 міл. 215 тыс., у 1926-27 годзе 10.346.600. **Прырост у 25 проц.** З іх—рабочых фізычнае працы, уключаючы сельска-гаспадарчых і сэзонных, у 1924-25 годзе было 5.448.000, у 1926-27 г.—7.060.000. **Прырост у 29,6 проц.** З іх—рабочых буйнае прамысловасьці ў 1924-25 г. было 1.794.000, у 1926-27 г.—2.338.000. **Прырост у 33 проц.**

Доля асоб наёмнае працы ў нацыянальным прыбытку складала ў 24-25 г. 24,1 проц., а ў 26-27 годзе гэта частка ўзрасла да 29,4 проц., што перавышае даваенныя разьмеры долі асоб наёмнае працы ў нацыянальным прыбытку на 30 проц., тады як доля іншых сацыяльных груп у нацыянальным прыбытку, у тым ліку буржуазеі, зьменшылася за гэты пэрыяд (напрыклад, доля буржуазеі панізілася з 5,6 проц. да 4,8 проц.).

Рэальны заработак рабочых па ўсёй дзяржаўнай прамысловасьці, без налічэньняў, складаў ў 24-25 годзе 25,18 маскоўскіх умоўных рублёў у месяц, у 26-27 г.—32,14 руб., што дае павышэньне за 2 гады **на 27,6 пр. і перавышае даваенны ўзровень на 5,4 проц.** З налічэньнямі (сац. страх, культпатрэбы, камунальныя паслугі і інш.) зарплата складала ў 24-25 годзе 101,5 проц. ад даваеннага, а ў 26-27 годзе 128,4 проц ад даваеннага.

Фонды сацыяльнага страхаваньня ўзрасьлі з 461 млн. руб. у 24-25 г. на 852 млн. руб. у 26-27 г., г. зн. на 85 проц., што дало магчымасьць правесьці праз дамы адпачынку і санаторыі 51000 чал., забясьпечыць дапамогаю 460000 беспрацоўных і 700000 пэнсыянэраў (інвалідаў працы і грамадзянскае вайны) і выдаваць хворым рабочым за пэрыяд хваробы поўны заработак.

Выдаткі на рабочае кватэрнае будаўніцтва 2 гады назад, у 24-25 г., складалі звыш 132 млн. руб., у 25-26 г.—звыш 230 млн. руб., у 26-27 г. 282 млн. руб., у 27-28 г. складуць звыш 391 млн. руб., уключаючы сюды 50 млн., вызначаных водлуг маніфэсту лічбаў. Усяго за 3 мінулыя гады на рабочае кватэрнае будаўніцтва, без індывідуальнага, выдадзена па лініі прамысловасьці, транспарту, выканкомаў і каапэрацыі 644,7 млн. руб., а разам з назначанымі на 27-28 год—1 міліярд 36 міліёнаў руб. Гэтыя асыгнаваньні за 3 гады далі магчымасьць адбудаваць 2 міліёны 594 тысячы квадр. мэтраў жыльлёвае плошчы, задаволіць 257 тыс. рабочых, а разам з сем'ямі—каля 900 тысяч чалавек.

Водлуг даных Наркампрацы, лік беспрацоўных узрос за 2 гады з 950 тысяч да 1 міл. 48 тыс. З іх індустрыяльных рабочых 16,5 проц., асоб-жа інтэлігентнай працы і некваліфікава-

(ПРАЦЯГ НА II СТАР.)

XV зьезд Усесаюзнай Кампартыі (б).

Працяг. Глядзі першую старонку.

ных—74 проц. Такім чынам беспрацоўе мае асноўнай сваёй крыніцай перанаселенасьць вёскі і толькі пабочнаю сваёю крыніцаю некаторую перанасычанасьць у нашай прамысловасьці вядомага мінімальнага складу індустрыяльных рабочых.

ВЫНІКІ: бясспрэчны ўздым матар'яльнага ўзроўню рабочае клясы ў цэлым.

ЗАДАЧА ПАРТЫІ: трымаць далей напрамак на далейшае палепшаньне матар'яльнага і культурнага становішча рабочае клясы, на далейшае павышэньне заработку рабочае клясы.

Вёска адраджаецца.

Пераходзячы да пытаньня аб сялянстве, Сталін зазначае, што прыбыткі сялянскага жыхарства ўсяго толькі 2 гады назад, у 24-25 г., складалі 3 міліярды 548 млн. руб., у 26-27 г. гэтыя прыбыткі ўзрасьлі да 4 міліярдаў 792 млн. руб., г. зн. на 35,1 проц. пры росьце сялянскага жыхарства за гэты пэрыяд усяго на 2,38 проц. Гэта бясспрэчны паказьнік таго, што ў **вёсцы паляпшаецца матар'яльнае становішча.** Дапамога працоўнаму сялянству ад дзяржавы ў 25-26 г. складала 373 млн. руб., у 26-27 г. 427 млн. руб. Спэцыяльная дапамога вясковай беднаце ў 25-26 г.: па лініі асыгнаваньняў на бяднейшыя гаспадаркі 38 міліёнаў руб., падатковыя палёгкі бядняцкім гаспадаркам—44 млн. рублёў, страхавыя палёгкі бяднейшаму сялянству—9 млн. руб., усяго 91 млн. руб. Спэцыяльная дапамога вясковай беднаце за 26-27 год па тых-жа пунктах: 39 міліёнаў руб., 52 млн. руб., 9 млн. р.—усяго каля 100 млн. руб.

Вынік: палепшаньне матар'яльнага становішча асноўных мас сялянства.

ЗАДАЧА ПАРТЫІ: трымаць ўдалей напрамак на далейшае палепшаньне матар'яльнага і культурнага становішча асноўных мас сялянства і раней усяго сялянскае беднаты, умацоўваць саюз рабочае клясы з сялянствам, уздымаць аўтарытэт рабочае клясы і яе партыі на вёсцы.

Напрамак на ізаляцыю новае буржуазеі.

Перайшоўшы да пытаньня аб новай буржуазеі і аб інтэлігенцыі, Сталін адзначае, што характэрнаю рысаю новае буржуазеі зьяўляецца тое, што яна ў процівагу рабочай клясе і сялянству ня мае падставы быць задаволенаю савецкаю ўладаю. Яе незадаволеньне ня ёсьць нешта сумнае. Яно мае свае карэньні ў жыцьці. Прасоўваньне наперад нашае прамысловасьці, прасоўваньне наперад нашых гандлёвых і каапэрацыйных органаў, палепшаньне нашага дзяржапарату ёсьць **прасоўваньне і палепшаньне з плюсам для рабочае клясы, з плюсам для асноўных мас сялянства, але з мінусам для буржуазеі,** з мінусам для сярэдніх пластоў наогул, для сярэдніх пластоў у горадзе ў асаблівасьці. Адгэтуль і контр-рэвалюцыйныя настроі ў гэтым асяродку. Адгэтуль зьменавехаўская ідэалёгія, як модны тавар на палітычным рынку буржуазеі.

Але побач з ростам незадаволеньня ў нетрах новае буржуазеі мы маем факт адыходу ад зьменавехаўства сотняў і тысяч працоўнае інтэлігенцыі ў бок савецкае ўлады. Сельская працоўная інтэлігенцыя, асабліва сельскае настаўніцтва, даўно павярнулася ў бок савецкае ўлады.

ЗАДАЧА ПАРТЫІ ў тым, каб праводзіць і далей напрамак на ізаляцыю новае буржуазеі і ўмацаваньне сувязі рабочае клясы з працоўнаю савецкаю інтэлігенцыяй гораду і вёскі.

Бюракратызм заб'ём ростам культурнасьці мас.

Аб бюракратызьме,—гаворыць далей Сталін,—гавораць так шмат, што няма патрэбы распаўсюджвацца аб гэтым. Слабасьць нашага дзяржапарату—у наліччы бюракратычных элемэнтаў у ім, якія псуюць і паганяць яго працу. Каб зьнішчыць гэты бюракратызм, трэба абнаўляць апарат за кошт новых адданых справе рабочае клясы людзей, перарабляць яго ў духу камунізму, а не ламаць яго, не расшрубоўваць яго. Ленін быў тысячу разоў правы, калі казаў: «Без апарату мы-б даўно загінулі. Без сыстэматычнае ўпартае барацьбы за палепшаньне апарату мы загінем да заснаваньня базы сацыялізму».

Ілюструючы некалькімі яскравымі прыкладамі «матушку валакіту» і выпадкі «задзьвіжэнства», Сталін зазначае на недапусьцімасьць падобных зьявішчаў і гаворыць: «Задача партыі ў тым, каб, змагаючыся проці бюракратызму і за палепшаньне дзяржапарату, выпальваць калёным жалезам такія агіднасьці ў нашай практыцы. Найлепшым сродкам барацьбы проці бюракратызму зьяўляецца ўзьняцьце культурнага ўзроўню рабочых і сялян, якое створыць магчымасьць, жаданьне, вуменьне кантраляваць дзяржаўны апарат зьнізу, сіламі саміх рабочых мас».

У гэтым сэнс і значэньне ленінскага лёзунгу аб культурнай рэвалюцыі. Вось што казаў наконт гэтага Ленін у сакавіку 22 г., перад адчыненьнем XI-га зьезду нашае партыі, у сваім лісьце ў ЦК, на імя таварыша Молатава: „Галоўнае, чаго нам не хапае—культурнасьці, вуменьня кіраваць. Эканамічна і палітычна НЭП цалкам забясьпечвае нам магчымасьць пабудовы фундаманту сацыялістычнае эканоміі. Справа толькі ў культурных сілах пралетарыяту і яго авангарду".

Гэтых слоў Леніна нельга забываць, таварышы (галасы «правільна»). Адгэтуль і **ЗАДАЧА ПАРТЫІ: узмацніць барацьбу за культурны ўздым рабочае клясы і працоўных гушчаў сялянства.**

Самая трывалая ўлада ў сьвеце.

А якія вынікі па лініі ўнутранага палітычнага становішча нашага краю? Вынікі такія, што **савецкая ўлада зьяўляецца самаю трывалаю ўладаю з усіх існуючых у сьвеце ўлад** (гучныя воплескі). Але гэта яшчэ ня знача, што ў нас у гэтай галіне ўсё добра. У нас ёсьць, напершае, беспрацоўе. Гэта яшчэ адмоўны бок, які мы павінны зьнішчыць альбо давесьці да мінумуму, чаго-б гэта ні каштавала. Падругое, у нас ёсьць недахопы ў кватэрным будаўніцтве для рабочых, кватэрны крызіс, які мы таксама павінны перамагчы, ці хоць давесьці да мінімуму ў бліжэйшыя годы. У нас ёсьць некаторыя храсткі антысэмітызму ня толькі ў вядомых колах сярэдніх пластоў, але і сярод вядомае часткі рабочых і нават сярод некаторых зьвеньняў нашае партыі. З гэтым злом трэба змагацца, таварышы, змагацца бязьлітасна. У нас ёсьць яшчэ такі адмоўны бок, як паслабленьне антырэлігійнае барацьбы. У нас, урэшце, ёсьць яшчэ страшэнная культурная адсталасьць ня толькі ў шырокім сэнсе гэтага слова, але і вузкім яго сэнсе, у сэнсе элемэнтарнае граматы, бо процант няпісьменнасьці ў СССР усё яшчэ не малы.

Усе гэтыя і падобныя ім мінусы павінны быць зьнішчаны, калі мы хочам пасоўвацца больш-менш паскораным тэмпам.

Паказальныя назначэньні.

У канцы гэтага разьдзелу свайго справаздачы Сталін, закрануўшы тры назначэньні за справаздачны пэрыяд, якія маюць паказальны характар, гаворыць: «Вы ведаеце, што старшынёю ВСНГ РСФСР зацьверджан т. Лобаў. Гэты рабочы мэталіст. Вы ведаеце, што старшынёю Моссавету абраны замест Каменева т. Уханаў—рабочы мэталіст, Вы ведаеце таксама, што старшынёю Ленінградзкага Савету абраны замест Зіноўева т. Камароў, таксама рабочы мэталіст. Значыць «лёрд-мэрамі» нашых сталіц зьяўляюцца ў нас рабочыя мэталісты (воплескі). Праўда, яны ня з шляхтаў, але кіруюць гаспадаркаю сталіц лепш усякіх шляхтаў (воплескі). Вы скажаце, што гэта ёсьць тэндэнцыя да мэталізацыі. Я думаю, што ў гэтым няма нічога кепскага (галасы: наадварот). Пажадаем капіталістычным краём, пажадаем Лёндану, пажадаем Парыжу таго, каб яны ўрэшце дагналі нас і выставілі-б у «лёрд-мэры» сваіх уласных мэталістаў (воплескі).

III. Унутрыпартыйнае становішча і апазіцыя.

У апошняй частцы свайго дакладу тав. Сталін, адзначыўшы **дасягненьні ў галіне партыйнага будаўніцтва** (лічбавы і ідэёвы рост партыі, сацыяльны склад партыі, палепшаньне кіруючае працы партыі ў галіне гаспадаркі, рост унутрыпартыйнае дэмакратыі, рост партыйных кадраў, рост аўтарытэту партыі сярод беспартыйных рабочых і г. д.) **і некаторыя недахопы** (адсутнасьць самакрытыкі ў справе кіраўніцтва гаспадарчымі арганізацыямі, перанос мэтадаў адміністраваньня ў партыю, замена мэтадаў перакананьня мэтадам адміністраваньня, праца ў некаторых галінах без пэрспэктывы, без заглядваньня ў будучыню), тав. Сталін пераходзіць да пытаньняў дыскусіі і апазіцыі.

Што дала сучасная дыскусія.

Ці мае які-небудзь сэнс,—кажа Сталін,—які-небудзь кошт дыскусія. Часам кажуць: начорта вы разьдзьмулі дыскусію, каму яна патрэбна, ці ня лепш было-б вырашыць спрэчныя пытаньні ўнутраным парадкам, ня выносячы сьмецьця з хаты? Гэта няправільна, таварышы. Дыскусія часам абсалютна патрэбна і бясспрэчна карысна. Усё пытаньне ў тым, якая дыскусія. Калі дыскусія праходзіць у таварыскіх рамках, у рамках партыйных, калі яна ставіць сваёю мэтаю сумленную самакрытыку, крытыку партыйных недахопаў, калі яна, значыць, паляпшае нашую справу і ўзбройвае рабочую клясу,—дык такая дыскусія патрэбна і карысна.

Але бывае інакшая дыскусія, якая ставіць сваёю мэтаю не палепшаньне нашае агульнае справы, а яе пагоршаньне, не ўзмацненьне партыі, а яе распад. Такая дыскусія вядзе звычайна не да ўзброеньня пралетарыяту, а да яго разброеньня. Нам такое дыскусіі не патрэбна (галасы: правільна, воплескі).

Цяпер мы можам сказаць без ваганьняў, што **дыскусія ў цэлым дала плюс.** Вынікі дыскусіі вядомы. На ўчарайшы дзень за партыю галасавала 724 тысячы таварышоў, а за апазіцыю—4 тысячы з лішкам. Вось вам вынік. Грукалі ў нас апазіцыянэры, што ЦК адарваўся ад партыі, партыя адарвалася ад клясы, а выходзіць, што **апазіцыя нават аднаго процанту ня мае.** Такі вынік.

Як магло здарыцца, што ўся партыя ў цэлым, а за ёю і рабочая кляса так востра адмежавалі апазіцыю? Там-жа, на чале апазіцыі, стаяць вядомыя людзі, з імёнамі, людзі здольныя сябе рэклямаваць (галасы: правільна), людзі, якія не хварэюць на сарамлівасьць (воплескі), здольныя сябе раздзяваць і паказваць і тавар на добры бок. А здарылася гэта таму, што кіруючая група апазіцыі аказалася групаю дробна-буржуазных інтэлігентаў, адарваных ад жыцьця, адарваных ад рэвалюцыі, адарваных ад партыі, ад рабочае клясы (галасы: правільна, воплескі).

Разыходзіны партыі з апазіцыяй.

Вы запытаеце, у чым-жа, нарэшце, супярэчнасьці між партыяй і апазіцыяй, па якіх пытаньнях праходзяць гэтыя супярэчнасьці. Па ўсіх пытаньнях, таварышы (галасы: правільна). Я мог-бы назваць 7 асноўных пытаньняў, па якіх ёсьць супярэчнасьці між партыяй і апазіцыяй.

Першае. Пытаньне аб магчымасьці пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва ў нашым краі. **Апазіцыя** адхіляе магчымасьць пераможнага будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі. Адхіляючы-ж такую магчымасьць, яна **коціцца** проста і адкрыта **на пазіцыю меншавікоў.** На гэтай устаноўцы грунтаваліся Каменеў і Зіноўеў, калі яны адмаўляліся іцьці на кастрычнікавае паўстаньне.

На гэтай-жа ўстаноўцы грунтаваўся Троцкі, калі ён ішоў на паўстаньне. Бо ён проста казаў, што калі пераможная пралетарская рэвалюцыя на Захадзе не пасьпее на дапамогу ў больш-менш блізкай будучыне, дык неразумна было-б думаць, што рэвалюцыйная Расея можа трываць проці кансэрватыўнае Эўропы.

Вы ведаеце, што Каменеў і Зіноўеў ішлі на паўстаньне з-пад палкі. Ленін іх падганяў кійком, пагражаючы выключэньнем з партыі (сьмех, воплескі), і яны павінны былі цягнуцца на паўстаньне. Троцкі ішоў на паўстаньне дабрахвотна, але ён ішоў не непасрэдна, а з агаворачкаю, якая ўжо тады зьбліжала яго з Каменевым і Зіноўевым. Цікава, што якраз перад Кастрычнікам, у чэрвені 1917 г., Троцкі палічыў магчымым перавыдаць у Ленінградзе сваю старую брашуру «Праграма міру», як-бы жадаючы гэтым сказаць, што ён ідзе на паўстаньне пад сваім уласным сьцягам.

Аб чым-жа ён гаворыць у гэтай брашуры? Ён палемізуе там з Леніным па пытаньні аб магчымасьці перамогі сацыялізму ў адным краі, лічыць гэтую думку Леніна няправільнаю і завярае, што ўладу давядзецца ўзяць, але калі ня прыдзе дапамогі ад пераможных заходня-эўрапейскіх рабочых, дык безнадзейна думаць, што рэвалюцыйная Расея можа стрываць перад кансэрватыўнаю Эўропаю. А хто ня верыць у крытыку Троцкага, той хварэе на нацыянальную абмежаванасьць.

А як ішоў Ленін на паўстаньне, як ішла партыя? Таксама з агаворачкаю? Не, **Ленін і яго партыя ішлі на паўстаньне без агаворак.**

Другое. Пытаньне аб дыктатуры пралетарыяту. Ёсьць у нас дыктатура пралетарыяту, ці няма яе? Пытаньне некалькі дзіўнае (сьмех). Не зважаючы на гэта, апазіцыя ўзьнімае яго ў кожнай сваёй заяве. Апазіцыя кажа, што ў нас тэрмідарыянскае перараджэньне. А што гэта азначае? Гэта азначае, што ў нас няма дыктатуры пралетарыяту, што ў нас правальваецца і ідзе назад і эканоміка і палітыка, і што мы ідзём не да сацыялізму, а да капіталізму. Усё гэта дзіўна і неразумна крыху. Але апазіцыя дамагаецца свайго.

Вось вам, таварышы, яшчэ адно разыходжаньне.

Трэцяе. Пытаньне аб блёку рабочага з серадняком. Апазіцыя праз увесь час утойвала свае адмоўныя адносіны да ідэі такога блёку. Яе пляцформа, яе контр-тэзісы цікавы ня столькі тым, аб чым там у іх гаворыцца, колькі тым, што хавала ад рабочае клясы апазіцыя. Але знайшоўся чалавек, Сьмірноў, таксама адзін з лідэраў апазіцыі, у якога хапіла адвагі сказаць праўду пра апазіцыю, выцягнуць яе на сьвет божы. І што-ж выявілася? Выявілася, што мы ідзём да пагібелі і калі хочам выратавацца, дык павінны ўчыніць разлад з серадняком. Ня вельмі разумна. Але затое зразумела. І тут меншавіцкія вушы паказаліся, нарэшце, да ўсеагульнага ведама.

Чацьвертае. Пытаньне аб характарыстыцы нашае рэвалюцыі. Калі адхіляецца магчымасьць пабудаваньня сацыялізму ў нашым краі, калі адхіляецца налічча дыктатуры пралетарыяту, неабходнасьць блёку рабочае клясы з сялянствам, дык што-ж застаецца тагды ад нашае рэвалюцыі, ад яе сацыялістычнага характару? Зразумела, што нічога, анічагуткі.

Пятае. Пытаньне аб ленінскай устаноўцы пры кіраўніцтве каленіяльнымі рэвалюцыямі. Ленін дапушчаў на вядомай стадыі і на вядомы тэрмін магчымасьць блёку і нават саюзу з нацыянальнай буржуазеяй каленіяльных краёў, калі яна вядзе вайну проці імпэрыялізму і калі яна не перашкаджае камуністам выхоўваць рабочых і сялянскую беднату ў духу камунізму. Грэх апазіцыі тут у тым, што яна канчаткова рве з гэтаю ўстаноўкаю Леніна, скачваючыся да ўстаноўкі 2-га Інтэрнацыяналу, які адхіляе магчымасьць падтрыманьня рэвалюцыйнага войска каленіяльных краёў проці імпэрыялізму. Гэтым і тлумачацца ўсе вывады, якія зрабіла наша апазіцыя ў пытаньні кітайскае рэвалюцыі. Вось вам яшчэ адно разыходжаньне.

Шостае. Пытаньне аб тактыцы адзінага фронту ў сусьветным рабочым руху. Грэх апазіцыі тут у тым, што яна рве з ленінскаю тактыкаю ў пытаньні аб наступовай заваёве мільённых мас рабочае клясы на бок камунізму. Для таго, каб мільённыя масы рабочае клясы перайшлі да камунізму, трэба, каб масы самі пераконваліся сваім уласным вопытам у правільнасьці палітыкі камунізму. Грэх апазіцыі ў тым, што яна цалкам адхіляе гэтую тактыку. Захопленая адзін час, неразумна захопленая гэтаю тактыкаю, яна рознымі спосабамі вітала справу згоды з генсаветам у Англіі, думаючы, што гэтая згода зьяўляецца «адною з самых сур'ёзных гарантый міру», «адною з самых сур'ёзных гарантый проці інтэрвэнцыі», «адным з самых сур'ёзных сродкаў абясшкоджваньня рэфармізму ў Эўропе» (гл. даклад Зіноўева на 14-м зьезьдзе УсеКП). Але сурова расчараваўшыся ў сваіх надзеях на абясшкоджваньне рэфармізму пры дапамозе Пэрселяў і Хіксаў, яна кінулася тады ў другую крайнасьць, адхіляючы поўнасьцю ідэю тактыкі адзінага фронту. Вось вам, таварышы, яшчэ адно разыходжаньне, якое дэманструе поўны адыход апазіцыі ад ленінскае тактыкі адзінага фронту.

Сёмае. Пытаньне аб ленінскай партыйнасьці, аб ленінскім адзінстве ва УсеКП і ў Камінтэрне. Апазіцыя тут поўнасьцю рве з ленінскаю арганізацыйнаю ўстаноўкаю, становячыся на шлях арганізацыі другой партыі, на шлях арганізацыі новага Інтэрнацыяналу. Вось вам 7 асноўных пытаньняў, якія сьведчаць, што па ўсіх гэтых пытаньнях апазіцыя скацілася да меншавізму. Ці можна лічыць гэтыя меншавіцкія погляды апазіцыі сумясьцімымі з ідэалёгіяй нашае партыі, з праграмаю нашае партыі, з яе тактыкаю, з тактыкаю Камінтэрну, з арганізацыйнаю ўстаноўкаю ленінізму? Ні ў якім разе, ні на адну хвіліну.

Сацыяльныя карэньні апазіцыі.

Вы скажаце: як магла нарадзіцца ў нас такая апазіцыя, дзе яе сацыяльныя карэньні? Я думаю, што сацыяльныя карэньні апазіцыі хаваюцца ў факце абдненьня дробна-буржуазных гушчаў гораду ў варунках нашага разьвіцьця, у факце незадаволеньня гэтых гушчаў рэжымам дыктатуры пралетарыяту, у імкненьні гэтых гушчаў зьмяніць такі рэжым, «палепшыць» яго ў духу ўстанаўленьня буржуазнае дэмакратыі.

Я ўжо казаў вышэй, што ў выніку нашага прасоўваньня наперад, у выніку росту нашае прамысловасьці, у выніку росту ўдзельнае вагі сацыялістычных формаў гаспадаркі адна частка дробнае буржуазеі, асабліва гарадзкое буржуазеі, абядняецца і гіне. Апазіцыя адбівае нараканьне і незадаволеньне гэтых гушчаў рэжымам пралетарскае рэвалюцыі. Вось дзе сацыяльныя карэньні апазіцыі.

Чаго партыя патрабуе ад апазіцыі.

Што-ж далей—пытаецца т. Сталін. Як рабіць далей з апазіцыяй? Раней, чымся перайсьці да гэтага пытаньня, я бы хацеў расказаць гісторыю аднаго вопыту супольнае працы з Троцкім, праробленага ў 1911 г. т. Каменевым. Гэта вельмі цікавае пытаньне. Тым больш, што яно магло-б даць некаторыя даныя, каб правільна падыйсьці да пастаўленага пытаньня.

У 1910 годзе быў пленум нашага ЦК заграніцаю. Ён абмяркоўваў пытаньне аб узаемаадносінах бальшавікоў з меншавікамі і, між іншым, з Троцкім (мы складалі тады частку аднае агульнае з меншавікамі партыі і называлі сябе фракцыяй). Пленум выказаўся за супрацоўніцтва з меншавікамі, значыцца і з Троцкім, наперакор Леніну, проці Леніна. Ленін застаўся ў меншасьці. А як-жа Каменеў? Каменеў узяўся ажыцьцяўляць супрацоўніцтва з Троцкім і ён ажыцьцяўляў гэтае супрацоўніцтва не без ведама і згоды Леніна, бо Ленін хацеў на вопыце даказаць Каменеву шкоднасьць і немагчымасьць супрацоўніцтва з Троцкім проці бальшавізму.

Так апавядае аб гэтым Каменеў у брашуры «Дзьве партыі», напісанай Каменевым ў 1911 годзе: «Вопыт супольнае працы з Троцкім—адважуся сказаць, вопыт шчыра мною праробленага—на чым толькі і сьведчаць эксплёатуемыя ў сучасны момант Троцкім мае лісты і прыватныя размовы, паказаў, што прымірэнцтва няўхільна коціцца да аховы ліквідатарства, рашуча становіцца на бок апошняга». І далей: «Калі-б «трацкізм» перамог, як настрой у партыі, дык якая-б воля была для ліквідатараў і для пярэчачых партыі плыняў».

Вось вам, таварышы, вопыт супольнае з т. Троцкім працы. Вынікі гэтага вопыту апісаны т. Каменевым у спэцыяльнай брашуры, якая была выдадзена ў 1911 годзе пад назваю «Дзьве партыі». Я перакананы, што гэтая брашура прынесла вялікую карысьць усім тым таварышом, якія яшчэ меюць ілюзіі наконт супрацоўніцтва з Троцкім, і вось у мяне так стаіць пытаньне, ці не паспрабуе тут Каменеў напісаць яшчэ адну брашуру пад назваю «Дзьве партыі» наконт сучаснага вопыту яго супрацоўніцтва з Троцкім (агульны сьмех, воплескі).

Гавораць, што апазіцыя цяпер мае на мэце падаць зьезду нейкую заяву наконт таго, што яна, апазіцыя, падначальваецца і будзе падначальвацца ўсім пастановам партыі (галасы: таксама, як і ў кастрычніку 1926 г.) Гавораць, што апазіцыя ставіць таксама пытаньне аб звароце ў партыю выключаных (галасы: «Ня пройдзе, няхай ідуць у меншавіцкае балота»). Я думаю таксама, таварышы, што гэта ня выйдзе (доўгія воплескі). Чаму партыя выключыла Троцкага і Зіноўева? Таму, што яны—арганізатары ўсяе справы апазіцыі (галасы: «правільна»), таму, што яны наставілі сабе мэтаю ламаць законы партыі; таму, што мы ня хочам мець у партыі шляхтаў; таму, што закон у нас у партыі адзін, і ўсе члены партыі роўныя ў сваіх правах. Калі апазіцыя хоча быць у партыі, дык няхай яна падначальвацца волі партыі, яе законам, яе загадам без агаворак. Ня хоча яна гэтага, дык няхай ідзе, дзе будзе больш вольна (галасы: „правільна»).

Пытаюць аб умовах. Умова ў нас адна: **апазіцыя павінна разброіцца** цалкам і поўнасьцю і ў ідэйных і ў арганізацыйных адносінах (галасы «правільна», гучныя доўгія воплескі). Яна павінна адмовіцца ад сваіх антыбальшавіцкіх поглядаў адкрыта і сумленна перад усім сьветам (галасы: «правільна", доўгія воплескі), Яна **павінна заклэйміць памылкі, ёю зробленыя, памылкі, якія ператварыліся ў злачынствы проці партыі, адкрыта і сумленна перад усім сьветам.** Яна павінна перадаць нам свае ячэйкі для таго, каб партыя мела магчымасьць распусьціць іх без астачы (галасы: «правільна», доўгія воплескі). **Або так, або няхай выходзяць з партыі. А ня выйдуць—выкінем** (галасы «правільна», доўгія воплескі.)

IV. Агульныя вынікі.

Вынікі наступныя: мы абараніліся перад абкружаючымі дзяржавамі, не зважаючы на вялікія цяжкасьці, не зважаючы на правакацыйныя выпады буржуазеі «вялікіх дзяржаў».

Другое—мы замацавалі змычку рабочае клясы СССР з рабочымі імпэрыялістычных краёў і калёній, не зважаючы на мора паклёпу буржуазнае прэсы.

Трэцяе—мы ўзьнялі аўтарытэт пралетарскае дыктатуры сярод мільёнаў працоўных мас ва ўсіх частках сьвету.

Чацьвёртае—мы, як партыя, дапамаглі Камінтэрну і яго сэкцыям умацаваць свой уплыў ва ўсіх частках сьвету.

Пятае—мы зрабілі ўсё, што толькі можа зрабіць адзін край для разьвіцьця і паскораньня сусьветнага рэвалюцыйнага руху.

Шостае—мы ўзьнялі нашую сацыялістычную індустрыю, устанавіўшы для яе разьвіцьця рэкордны тэмп і наладзіўшы яе гегемонію ва ўсёй народнай гаспадарцы.

Сёмае—мы ўстанавілі сувязь сацыялістычнае індустрыі з сялянскаю гаспадаркаю.

Восьмае—мы ўзмацнілі саюз рабочае клясы з серадняком пры апоры на беднату.

Дзевятае—мы ўзмацнілі дыктатуру пралетарыяту ў нашым краі, не зважаючы на варожае міжнароднае абкружэньне, паказаўшы рабочым усіх краёў, што пралетарыят здольны ня толькі руйнаваць капіталізм, але і будаваць сацыялізм.

Такі агульны вынік.

Вывад які? Вывад адзін: **мы стаімо на правільным шляху, палітыка нашае партыі правільная** (галасы: правільна, воплескі).

А з гэтага выходзіць, што, ідучы па гэтым шляху, мы прыдзем напэўна да перамогі сацыялізму ў нашым краі да перамогі сацыялізму ва ўсіх краёх (доўгія воплескі).

Гэта яшчэ ня значыць, што ў нас ня будзе цяжкасьцяў на нашым шляху. Цяжкасьці будуць. Але мы іх не баімося, бо мы—бальшавікі, загартаваныя ў агні рэвалюцыі. **Цяжкасьці будуць, але мы іх пераможам,** як перамагалі да гэтага часу, **бо мы—бальшавікі,** загартаваныя жалезнай партыяй Леніна, каб змагацца з цяжкасьцямі, а ня хныкаць.

Іменна таму, што мы—бальшавікі, мы пераможам напэўна.

ТАВАРЫШЫ! ДА ПЕРАМОГІ КАМУНІЗМУ Ў НАШЫМ КРАІ, ДА ПЕРАМОГІ КАМУНІЗМУ ВА ЎСІМ СЬВЕЦЕ! (Гучныя і доўгія воплескі. Усе ўстаюць і наладжваюць тав. Сталіну авацыю. Сьпяваюць «Інтэрнацыянал».)

Дзённае пасяджэньне 5-га сьнежня.

ПРАЦЯГ СПРЭЧАК ПА СПРАВАЗДАЧЫ ЦК.

ПОСТЫШАЎ (Харкаў) напамінае, што вось ужо трэці партыйны зьезд зраду мае справу з апазіцыяю. Да 15 зьезду партыі апазіцыя падышла разьбітаю дашчэнту. І зараз асноўным пытаньнем для партыі зьяўляюцца ня спрэчкі з апазіцыяю, а тое, каб назаўсёды з ёю скончыць.

ГАЛАШЧОКІН (Казакстан) зазначае, што тэмп росту нашае гаспадаркі адхіляе паклёпы апазіцыі, якая сьцьвярджае немінучасьць крызісаў і гаспадарчых катастроф. Шлях, па якім ідзе партыя і пралетарыят СССР, узяты правільны. У інтарэсах забясьпечаньня далейшае нармальнае працы для партыі неабходна зараз-жа скончыць з апазіцыяю. Прамоўца лічыць, што апазіцыю неабходна зьліквідаваць без усякіх умоў, бо якія-б умовы яна ні высунула, і як-бы гэтыя ўмовы ня можна было-б ня прыняць, яны дадуць магчымасьць апазіцыі далей праводзіць сваю руйнуючую працу.

Крупская асноўнаю прычынаю ўсіх памылак апазіцыі, усяе яе руйнуючае працы лічыць, што апазіцыя страціла чуцьцё таго, чым жыве рабочае кляса. Характэрным для апазіцыі зьяўляецца значная стракатасьць яе складу, што ў сваю чаргу растлумачвае фальш, якая маецца ў дзейнасьці апазіцыі. Да апазіцыі далучыліся розныя няпэўныя элемэнты, якія накіроўваюць яе на няправільны шлях. Ці могуць быць устаноўлены якія-небудзь дагаворныя ўзаемаадносіны з апазіцыяю, пытаецца т. Крупская і адказвае: не, ня могуць.

ПОЗЭРН (Ленінград) лічыць, што пытаньне аб апазіцыі па сутнасьці ўжо вырашана. Сьвяткаваньне 10-е гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі па сутнасьці зьявілася галасаваньнем працоўных СССР за давер'е партыі і яе ЦК. Другім галасаваньнем, але ў міжнародным абхваце, зьявіўся зьезд прыяцеляў СССР. Трэцім галасаваньнем зьяўляецца 77 тысяч пралетарыяў, якія ўступаюць зараз у нашу партыю. Гэтае трайнае галасаваньне паказвае, што сіла партыі, яе аўтарытэт у выніку барацьбы з апазіцыяю ўзрасьлі, як ніколі раней. Мы маем зараз цьвёрды грунт і можам спакойна працаваць над вырашэньнем задач, яшчэ ня вырашаных. Адною з найгалоўнейшых задач т. Позэрн лічыць неабходнасьць наступу на прыватны капіталістычны сэктар гаспадаркі. Для вырашэньня гэтай задачы неабходна мабілізаваць усе сродкі, якія маюцца ў партыі.

АРЦЮХІНА (Масква) лічыць адным з значных дасягненьняў партыі за апошнія два гады пасьпешнае ўцягваньне работніц і сялянак у савецкую працу.

Выступленьне тав. Ракоўскага.

Ракоўскі ў прамове, не адзін раз перапыняемай абуранымі пратэстамі дэлегатаў, спыняецца на пытаньнях міжнароднае палітыкі.

Яшчэ на жнівеньскім пленуме ЦК—гаворыць т. Ракоўскі,—меншасьць партыі падала заяву, што перад чужаземным ворагам, які будзе пасягаць на Савецкі Саюз, мы будзем яго бараніць бязумоўна і безагаворачна пад кіраўніцтвам існуючых органаў партыі і Камінтэрну. Ракоўскі далей гаворыць, што 15 зьезд партыі гатоў паўтарыць памылкі 14 зьезду як у ацэнцы існуючага міжнароднага становішча, так і ў вывадах, якія выцякаюць з гэтае ацэнкі. Палітыка міжнароднае буржуазеі ў сучасны момант, гаворыць ён, накіравана на поўную ізаляцыю Савецкага Саюзу. Гэты факт недаацэньвае ЦК партыі.

З другога боку, я не магу падзяляць аптымізму таварыша Сталіна,—гаворыць далей Ракоўскі,—на падставе росту сымпатый мірнага пралетарыяту да СССР. Той факт, што пралетарыят Англіі ніяк не рэагаваў на разрыў дыплёматычных зносін з СССР, які адбыўся па ініцыятыве ангельскага ўраду, павінен нас папярэдзіць ад вывадаў аб вельмі значным рэвалюцыянізаваньні эўрапэйскіх рабочых мас. Водлуг думкі т. Ракоўскага, Савецкі Саюз яшчэ ніколі ня быў пад гэткім ідэйным абстрэлам, пад якім ён знаходзіцца ў сучасны момант. У падмацаваньне гэтага т. Ракоўскі падае цытаты з буржуазных пэрыядычных выданьняў.

З-тае прычыны, што вызначаны па рэглямэнту час мінуў, т. Ракоўскі зьвяртаецца з просьбаю працягнуць час. Тав. Рыкаў ставіць гэтае пытаньне на галасаваньне, у выніку якога для здавальненьня просьбы т. Ракоўскага няма ніводнага голасу.

(Працяг спрэчак ў заўтрашнім нумары).

ПОЛЬСКА ЛІТОЎСКАЕ ПЫТАНЬНЕ Ў ЛІЗЕ НАЦЫЙ.

Адчыненьне сэсіі рады Лігі.

ЖЭНЕВА, 5-ХІІ. Сэсія рады Лігі Нацый адчынілася 5-га сьнежня раніцою. Першае пасяджэньне было прысьвечана другарадным пытаньням. У другой палове дню адбыліся шматлікія спатканьні міністраў замежных спраў асобных дзяржаў.

У цэнтры перамоў стаіць польска-літоўскі канфлікт. Разгляд скаргі Літвы будзе, як відаць, перададзен камісіі, а пленум рады зоймецца толькі агульным пытаньнем аб польска-літоўскіх адносінах, якое будзе вырашана іменна на гэтай сэсіі.

Прыезду Пілсудзкага чакаюць у Жэнэве 8-га ці 9-га сьнежня.

Пытаньні жыцьця і сьмерці для Лігі.

ВАРШАВА, 5-ХІІ. Як паведамляе жэнеўскі карэспандэнт газэты «Экспрэс Поранны», у гутарцы з Залескім Брыян заявіў, што пасьпяховая ліквідацыя Лігаю Нацый польска-літоўскага канфлікту зьяўляецца для Лігі „пытаньнем жыцьця і сьмерці".

ПОЛЬШЧА СЬЦЯГВАЕ ВОЙСКА НА ГРАНІЦУ ЛІТВЫ.

КОЎНЯ, Газэта „Эхо" паведамляе, што ў раёне Олькенікі павялічваецца польскае прыгранічнае войска. На станцыю Ораны прысланы 2 новыя роты польскіх прыгранічнікаў. Мінулаю ноччу яны прайшлі па дэмаркацыйнай лініі. У Вількамірскім раёне на польскім баку былі чутны асобныя вінтовачныя стрэлы.

„Летува" паведамляе, што ў Ораны прыехаў польскі батальён, прывезены на фурманках патроны і ручныя гранаты і чакаецца прыезд коньніцы з Пазнаньні.

Завяраюць, што яшчэ 15-га сьнежня павінны адбыцца нейкія падзеі.

Канцэнтрацыя літоўскіх войск?

„Кур. Віл." паведамляе, што на літоўска-польскім пагранічны канцэнтруюцца аддзелы літоўскай пяхоты.

Ці не адна гэта з чарговых качак, якія цяпер распаўсюджваюцца польскай дэфэнзывай дзеля вядомых мэт.

Паразуменьне ў Кляйпэдзе

Бюро «Вольфа» паведамляе, што між губэрнатарам Кляйпэды і партыямі кляйпэдзкага сойму ў справе ўтварэньня дырэктарыяту дайшло да паразуменьня. У склад дырэктарыяту маюць увайсьці ня толькі прадстаўнікі партыі большасьці, а таксама і зьбліжаныя да іх меншыя партыі і літоўскія партыі.

Замах на камэндата.

У Марыямпалі, як паведамляе «Дз. Віл»., зроблен замах на камэндата Марыямпальскага павету лейтэнанта Жымаса. Ходзяць чуткі, што замах зроблен літоўскімі сацыял-дэмакратамі.

Склад зброі ў Аліце.

Літоўская паліцыя выкрыла гэтымі днямі патаемны склад зброі і амуніцыі, у якім знаходзілася 60 ручных карабінаў, некалькі скрынь ручных гранат. Склад гэты знаходзіўся ў прыватным памяшканьні члена с.-дэмакратычнай партыі А. Славічуса.

Віленскі магістрат і літоўскія эмігранты.

2 сьнежня г. г. віленскі магістрат пастанавіў, што ўсе літоўскія эмігранты, якія знаходзяцца цяпер на абшары Вільні, карыстаюцца ўсімі правамі, якімі карыстаюцца сталыя жыхары Вільні.

Быўш. пасол Кайрыс у Вільні.

Гэтымі днямі прыяжджаў у Вільню б. пасол літоўскага сойму сацыял-дэмакрат Кайрыс. Ён змушан быў выехаць з Літвы з прычыны абвешчаньня партыі с.-дэмакратаў нелегальнай.

Спатканьне Літвінава з Чэмбэрленам.

ЖЭНЕВА, 5-ХІІ. Водлуг узаемнага жаданьня адбылося спатканьне Літвінава з Чэмбэрленам.

Пасьля спатканьня было агалошана пагоджанае між імі паведамленьне наступнага зьместу: „Сёньня пасьля абеду ў гатэлі Бо-Рываж адбылося спатканьне між Літвінавым і Чэмбэрленам. Спатканьне дало магчымасьць вольна абмяняцца думкамі адносна дачыненьняў між савецкімі і ангельскім урадамі. Аднак, у гутарцы не ўдалося знайсьці базы для пагоджаньня".

Гутарка Літвінава з Штрэзэманам.

ЖЭНЕВА, 5-ХІІ. Учарайшая гутарка з Штрэзэманам была прысьвечана, галоўным чынам, польска-літоўскаму канфлікту і неабходнасьці спыненьня становішча вайны між абедзьвюма дзяржавамі.

Гутарка мела вельмі шчыры і прыяцельскі характар. Літвінаў разьвіваў пункт гледжаньня, выкладзены ў вядомых нотах савецкага ўраду да Польшчы і Літвы. Гутарка выявіла адсутнасьць прынцыповых разнагалосьсяў між савецкім і нямецкім урадамі ў гэтым пытаньні.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-й гадз. уночы).

Канфлікт між СССР і Францыяй ліквідаваны канчаткова.

Заява Брыяна ў гутарцы з Літвінавым.

ЖЭНЕВА, 5-ХІІ. У гутарцы з Літвінавым Брыян запэўніў яго, што непаразуменьні, узьнікшыя ў зьвязку з інцыдэнтам з Ракоўскім, можна лічыць канчаткова ліквідаванымі. Аб разрыве зносін ня можа быць і гутаркі.

Затым Брыян паведаміў аб прыезьдзе ў Парыж новага савецкага пасла і заявіў, што перамаўленьні аб даўгох, крэдытах і гарантыйным угаворы будуць адноўлены.

Пры абмеркаваньні польска-літоўскага канфлікту Літвінаў і Брыян прызналі, што становішчу вайны між Літвой і Польшчай павінен быць палажан канец.

У часе гутаркі былі зачэплены таксама пытаньні міжнароднага характару.

Гутарка Літвінава з Залескім і Вальдэмарасам.

ЖЭНЕВА, 5-ХІІ. Пасьля гутаркі з Чэмбэрленам Літвінаў прыняў Вальдэмараса, а затым наведаў Залескага. Як і пры ранейшым спатканьні, Літвінаў пераконваў Вальдэмараса аб неабходнасьці спыніць становішча вайны між Літвой і Польшчай.

Што тычыцца аднаўленьня дыплёматычных зносін між гэтымі краінамі, дык Літвінаў заявіў Вальдэмарасу і Залескаму, што ён не ўваходзіць у разгляд гэтага пытаньня, якое тычыцца выключна і непасрэдна Польшчы і Літвы. Абодвым міністрам Літвінаў заявіў, што для савецкага ўраду самае важнае—гэта адхіленьне ўсякіх прычын, якія могуць парушыць мір.

У доўгай гутарцы з Залескім Літвінаў падкрэсьліў мірныя кроні савецкага ўраду, значэньне фактычнай незалежнасьці Літвы пры любым урадзе, а таксама незалежнасьці балтыцкіх дзяржаў для справы міру.

У гутарцы з Залескім былі зачэплены таксама перамаўленьні аб гарантыйным і гандлёвым уговоры. Залескі зрабіў самае заспакойваючае запэўненьне адносна палітыкі Польшчы.

* * *

ЖЭНЕВА, 5-ХІІ. Шостага Літвінаў выехаў у Маскву.

Падрыхтоўка да сямігадзіннага рабочага дню ў БССР.

(Гутарка з членам камісіі ВСНГБ па ўвядзеньні 7-мігадзіннага рабочага дню тав. Шульманам).

З часу ўтварэньня камісіі пытаньне аб увядзеньні 7-мігадзіннага рабочага дню атрымала практычнае выяўленьне. Ня гледзячы на труднасьці, якія зьвязаны з ажыцьцяўленьнем маніфэсту ўраду СССР, усё-ж трэба адзначыць, што магчымасьць ажыцьцяўленьня гэтага маніфэсту адносна 7-мігадзіннага рабочага дню зьяўляецца ня пустым гукам.

Як і ў Саюзе, у БССР ёсьць шмат галін прамысловасьці, у якіх і зараз існуе 7-мігадзінны рабочы дзень, прычым вынікі яго для вытворчасьці зусім станоўчыя. Так, напрыклад, на махорачнай ф-цы ў Віцебску ў бандэрольным аддзяленьні ў 1914 годзе пры 10-цігадзінным рабочым дні вытворчасьць працы складала 12 скрынак, у 1919-20 годзе—да 11 скрынак, а ў 1926-27 г. пры 7-мігадзінным рабочым дні маем 21 скрынку. Гэта было дасягнута ў выніку значнага пашырэньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. Адгэтуль зусім зразумела, што пры максымальнай увазе да паляпшэньня мэтадаў нашай працы ўвядзеньне 7-мігадзіннага рабочага дню ні ў якім выпадку ня можа дрэнна ўплываць на вытворчасьць, а значыць і на зарплату.

Цэлым шэрагам навуковых работ даведзена, што пры скарачэньні рабочага дню прадукцыйнасьць працы рабочага павышаецца, бо, больш адпачыўшы, рабочы можа інтэнсыўней працаваць.

Апроч рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія ідуць па лініі ўдасканаленьня абсталяваньня і ўвядзеньня найлепшых спосабаў вытворчасьці, адною з неабходных умоў, забясьпячаючых нястратнае ўвядзеньне 7-мігадзіннага рабочага дню, зьяўляецца лепшае выкарыстаньне рабочага дню, бо ён, дзякуючы шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных фактаў, яшчэ на многіх прадпрыемствах поўнасьцю не нагружан.

Далей, важным мерапрыемствам зьявіцца ўвядзеньне 3-хзьменнай працы. Апошняе, апроч лепшага выкарыстаньня абсталяваньня, дасьць скарачэньне некаторых сталых расходаў. Праўда, увядзеньне 3-хзьменнай працы ўпіраецца ў пытаньне забесьпячэньня прамысловасьці сыравінай і неабходнымі сродкамі.

Бліжэйшай задачай камісіі зьявіцца адшуканьне шляхоў да магчымага пераводу на 7-мігадзінны рабочы дзень асобных галін прамысловасьці БССР у залежнасьці ад спэцыфічных умоў.

Ужо запрапанована ўсім трэстам і прадпрыемствам прапрацаваць у сябе гэтыя пытаньні і ўнесьці ў ВСНГ канкрэтныя прапановы.

Побач з падрыхтоўчай працай па ўвядзеньні 7-мігадзіннага рабочага дню адпачасова трэба заняцца вырашэньнем справы аб рацыянальным выкарыстаньні рабочымі лішняй гадзіны адпачынку. Трэба, каб гэтая гадзіна дала магчымасьць рабочаму павялічыць сваю кваліфікацыю (паведаньне вытворчых гурткоў, курсаў як спэцыяльных, так і агульна-адукацыйных і інш.).

Ня гледзячы на вялікія труднасьці, якія сустрэнуцца на шляху да ажыцьцяўленьня маніфэсту ўраду СССР, неабходна цьвёрда пераканацца, што, **пры агульных патугах усёй прамысловай грамадзкасьці, увядзеньне 7-мігадзіннага рабочага дню зьявіцца канкрэтнаю справаю бліжэйшай будучыні.**

С. Азер.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Дасягненьні і хібы крэдытнай каапэрацыі.

Магілеў. Крэдытныя таварыствы акругі яднаюць 38 процантаў сялянскіх двароў.

Звыш мільёну рублёў зараз знаходзіцца на руках у якасьці пазычак. Крэдыт даў жывёлу безканёвым і безкароўным гаспадаркам, праз крэдыт сялянства набывае машыны, гатункова насеньне, дапамагае ў часе слўбы звычайным насеньнем.

75 процантаў усіх сялянскіх закупак машын, штучных угнаеньняў, культурных траў праходзіць праз сыстэму сельска-гаспадарчага крэдыту.

Слабей стаіць справа са збытам сельска-гаспадарчай прадукцыі, але-ж і тут за апошні год зварот складае каля 1 мільёну рублёў.

Крэдыт рухае ўперад сельска-гаспадарчую каапэрацыю: няма такога каапэратыву, які-б не атрымаў пазыкі праз сельска-гаспадарчы крэдыт.

Разам з тым, трэба адзначыць і хібы ў працы крэдытнай каапэрацыі.

Сродкі, якія прызначаны на крэдытаваньне, часам ідуць на іншыя мэты. Ёсьць крэдытныя таварыствы, якія 20 і нават больш процантаў крэдытных сродкаў выдаткоўвалі не па прызначэньню.

Не заўсёды пазыкі ідуць у бядняцка-серадняцкія колы насельніцтва. Нават спэцыяльныя сумы на крэдытаваньне беднаты (110 тысяч рублёў па акрузе) іншы раз трапляюць не ў бядняцкія рукі.

Доўгатэрміновыя крэдыты ідуць часамі як кароткатэрміновыя.

Надта вялікі процант (7 проц.) пазык, якім ужо вышоў тэрмін.

Уклады ад пайшчыкаў складаюць яшчэ невялікую суму: на кожную сотню рублёў, укладзеных дзяржаваю сродкаў на крэдытаваньне, прыходзіцца толькі 6 рублёў сялянскіх укладаў.

Ня зусім добра было і з парадкам выдачы пазык: бядняк звычайна павінен быў прадстаўляць паручыцеляў, а гэта іншы раз аддавала яго ў няволю да кулачка і наогул было нязручна. Зараз у гэтай справе дадзены з акругі паказаньні ў тым сэнсе, што калі бядняк трымае сябе гаспадарча, цьвярозы, імкнецца да паляпшэньня сваёй гаспадаркі, дык пазыкі павінны выдавацца бяз ніякіх паручыцеляў і толькі ў асобных выпадках—патрабаваць паручыцельствы ад камітэтаў узаемадапамогі.

Адбываючыяся зараз пераходы крэдытных таварыстваў на новы статут павінны зьнішчыць выпадкі выдаткоўваньня сродкаў не па прызначэньні і наогул палепшыць працу крэдытных таварыстваў.

І няхай справаздачна-перавыбарчая кампанія ў крэдытнай каапэрацыі пакладзе моцны пачатак зьнішчэньню хібаў у яе працы.

Магілеўскі.

Як ідзе беларусізацыя.

Магілеў. Насельніцтва Магілеўшчыны на 82 проц. складаецца з беларусаў; яўрэяў і расейцаў—па 7,7 проц., палякаў—1,5 пр.; іншыя нацыянальнасьці складаюць менш процанта.

Царская палітыка, якая грунтавалася на нацыянальным прыгнечаньні працоўных і гвалтоўнай іх русіфікацыі, заставіла савецкай уладзе ў спадчыну гаспадарчую і культурную адсталасьць, варожыя адносіны паміж нацыянальнасьцямі і русіфікаваны горад. Вёска ў масе сваёй засталася беларускай. Гэтыя ўмовы ўскладнялі практычнае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі па акрузе.

У канцы лістапада нацыянальная камісія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту зрабіла абсьледаваньне, як Акруговы Выканаўчы Камітэт у нацпытаньні выконваў пастановы ІІ-й сэсіі ЦВК.

Даныя абсьледаваньня паказалі, што праца Акрвыканкому па ажыцьцяўленьню практычных мерапрыемстваў нацпалітыкі адпавядала дырэктывам вышэйшых партыйных і савецкіх органаў. Ёсьць дасягненьні, але нельга сказаць, што ўсё зроблена. Няспрыяючыя адносіны да беларускай мовы часткі працаўнікоў савецкага апарату (былое чыноўніцтва) яшчэ застаюцца, іх трэба перамагчы, Беларуская гутарка рабочага і селяніна, беларуса, у савецкіх устанах вах яшчэ заглушаецца расейскай гутаркай чыноўніка з русіфікатарскімі тэндэнцыямі.

У асноўным мерапрыемствы Акруговага Выканаўчага Камітэту ў справе нацпалітыкі былі накіраваны на поўнае прыстасаваньне дзяржаўных, грамадзкіх і культурна-асьветных установаў да абслугоўваньня працоўных кожнай нацыянальнасьці на іх роднай мове. На грунце гэтага, на акрузе праведзена вялікая праца па арганізацыі нацыянальных саветаў (польскіх яўрэйскіх і латыскіх). У Магілёве адчынены польскі і яўрэйскі вучасткі народных судоў.

Культурна-асьветныя ўстановы (школы, клюбы, бібліатэкі і інш.), у залежнасьці ад нацыянальнасьці акалючага насельніцтва, працу сваю вядуць на мове данай нацыянальнасьці.

Выбарчы склад саветаў і выканкомаў, а таксама і склад тэхнічнага апарату ў пераважнай большасьці ўстаноў і арганізацый забясьпечан прадстаўнікамі і супрацоўнікамі кожнай нацыянальнасьці.

Як ужо і ад начана вышэй, у справе беларусізацыі ня ўсё зроблена, пры чым найбольшымі недахватамі тут трэба лічыць: слабасьць работы акруговай нацыянальнай камісіі, а ў зьвязку з гэтым недастатковы нагляд за выкананьнем установамі і арганізацыямі пастаноў ІІ-й сэсіі ЦВК.

Да гэтага часу ў значнай частцы вядзецца праца на расейскай мове апаратам устаноў: акруговага ваеннага камісарыяту, акрсельсаюзу, акр. прафсавету і акрсаюзу спажывецкіх таварыстваў. Патрэбна з боку акрвыканкому больш настойлівасьці і рашучых мерапрыемстваў да тых, хто ня выконвае своечасова дырэктыў вышэйшых органаў па нацпытаньню.

Савецкі апарат Магілеўшчыны ў бліжэйшыя часы павінен пазбавіцца ад чыноўніка-русіфікатара.

Л—ч.

ЛІКВІДУЕМ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ.

Бабруйск, 6-XII. У гарадзкіх лікпунктах і школах малапісьменных навучаецца каля 320 пісьменных сяброў саюзаў. Т-ства «Прэч няпісьменнасьць» у бліжэйшым часе мяркуе арганізаваць яшчэ 2 лікпункты пры жылішчна-арэндных таварыствах і 1 лікпункт для жаночых дэлегатак.

1007 ПРАЦОЎНЫХ ПРАЙШЛО ПРАЗ ДАМЫ АДПАЧЫНКУ.

Віцебск, 6-XII. Страхавая каса за апошні год прапусьціла праз дамы адпачынку 1007 чалавек, з якіх большасьць рабочых ад варштату.

СЯЛЯНЕ АДЧУВАЮЦЬ ВЫНІКІ МАНІФЭСТУ ЎРАДУ.

Валынец, 6-XII. Група беднаты Прудзінскага сельсавету ў прысутнасьці членаў апошняга разьмеркавала скідачны фонд, які дадзены сялянам-беднякам па маніфэсту ўраду. Гэтую скідку атрымалі самыя бяднейшыя, якія шчыра дзякуюць савецкую ўладу за дапамогу.

РАМАНТУЕЦЦА ЗАВОД.

Амсьціслаўль, 6-XII. У горадзе рамантуецца Казіміра-Слабодзкі вінзавод. Рамонт заводу абыйдзецца больш 15.000 руб. і ў хуткім часе ён будзе скончаны.

ПЕРАВЫБАРНАЯ КАМПАНІЯ Ў СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Ворша, 6-XII. Па апошніх даных справаздачна-перавыбарчыя сходы праведзены ў 8 спажывецкіх таварыствах акругі. Кампанія праходзіць досыць актыўна, расьце самадзейнасьць і актыўнасьць пайшчыкаў. На сходах прысутнічала ад 40 да 60 проц. агульнага ліку пайшчыкаў. У новыя праўленьні абіраюцца беднякі і лепшая частка серадвякоў.

Новая вэтэрынарная лячэбніца.

Полацак, 5-12. Распачалася пабудова вялікай вэтэрынарнай лячэбніцы. Лячэбніца будуецца з агнятрывалага матар'ялу. Пабудова будзе каштаваць больш 20.000 рублёў.

Маленькі фэльетон.

Пра „Іванушак"...

Так!.. Гэта яно, мусіць, і праўда, што нашыя нацыянальныя рысы,—гэта першая:

— Каб жа яно ведаць?

Другая:

— Ды я-ж такі і ведаў!..

... Бо, скажам, возьмем наш тэатр. Другі, Дзяржаўны, Беларускі.

Стараліся!..

Дамагаліся!...

Ткі-й дамагліся!..

Скампрамэтавалі...

А цяпер адзін да аднаго:

— Каб жа яно ведаць?

— Ды я так і ведаў!

— Дык чаго-ж ты маўчаў?

— Ды каб жа яно ведаць?..

Словам, малайцы земляки, «шавяляць» мазгамі.

Акурат, як тыя гістарычныя Іванушкі «шавяляць»,—што на вясельлі плачуць, а на хаўтурах са ўласьціваю ім чуласьцю сьціпла жадаюць:

— Насіць вам не пераносіць!

. . . . . .

Таварышы, тэатральныя крытыкі, гэта я менавіта пра вас, бо гэта-ж зусім памылковы погляд, быццам усё тое, што нашае, трэба лаяць.

Дальбог памылковы!

Іванушкі,—верце на слова,—памылковы!

Я ведаю, некаторыя тэатральныя крытыкі, прачытаўшы гэныя радкі, засьмяюцца:

— Іш ты, скажуць, як ён жартуе...

Нашыя крытыкі могуць уявіць сабе, што я гэта напісаў дзеля дасьціпнасьці ды й будуць сьмяяцца...

Дурачкі-Іванушкі,—над кім будзеце сьмяяцца?

. . . . . .

Бязупынна брыкаючы наш тэатр, нашыя, як завначае Тодар Глыбоцкі, „аднакапытныя" крытыкі, лічаць сябе дужа культурнымі, дужа асьвечанымі, дужа інтэлігентнымі...

І гэтае ўяўленьне ў іх складаецца на тэй грунтоўнай падставе, што яны ня могуць шчыпаць травы...

Ну, што-ж—сьмейцеся, бо праўдзіва яшчэ ў свой час заўважыў як кажа Шчадрын, «смейся дурачок! сам господин Зубатов отменно рад, што ты смеешся... в другое время он сказал бы тебе: «чего ска-а-ти а рот до ушей дереш?"—Ну, а теперь нічего...

. . . . . .

Алёша.

Тэатральны маладняк.

(„Каля тэрасы" М. Грамыкі. БДТ2).

Беларускае тэатральнае жыцьцё за апошнія гады мае бязумоўна зусім іншы характар, чымся, скажам, гадоў восем таму назад. Кожная, нават самая дробная пастаноўка мае калёсальнейшую перавагу над буйнейшымі пастаноўкамі ранейшага перыяду нашага тэатру. Але наша тэатральная публіка, распесьціўшыся на такіх шэдэўрах як «Кастусь Каліноўскі», «Кар'ера таварыша Брызгаліна», «Перамога» і г. д. аднеслася з самага пачатку даволі скептычна да маладзейшай генэрацыі беларускага тэатру—да БДТ2. Прычын гэтаму было шмат—і тое, што глядач любіць вядомае імя, і тое, што ён падкі на розныя «баявікі» і, нарэшце—самая звычайная прывычка. Да першага тэатру прывыклі—другога яшчэ ня ведалі! З другога боку, БДТ2 пачаў сваю працу ў Менску бадай што не з таго, з чаго трэба было. І здавалася, што «Апраметная» (даволі такі паганая рэч) цяжкім каменем ляжа на далейшы посьпех маладога тэатру.

Апошняя навінка БДТ2 — п'еса Грамыкі «Каля тэрасы» адразу мяняе настроі. Ёсьць, бязумоўна, недахваты і ў п'есе і ў пастаноўцы (пра гэта ніжэй), але наш стары тэатр ня так ужо часта бачыў такое захапленьне, якое заўладала публікай калі скончыўся спэктакль 3-га сьнежня.

Бываюць розныя сцэнічныя творы. Можна даць геніяльнейшы сцэнічны твор, але, калі яго тэма, яго пабудова, уся яго ўстаноўка не падыходзіць да балючых пытаньняў бліжэйшага часу—такі твор ня будзе мець ніякага посьпеху. З другога боку, калі сцэнічны твор напісаны з выключнай устаноўкай на ілюстраваньне тэзісаў ва ўчарайшым нумары газэты—ён будзе глядзецца і камэнтыравацца з вялікаю натугаю і, часта-густа, у гледача будуць патрэсківаць скіўіцы ад надмернага пазяханьня—трэба праўду казаць, што такога гатунку творы наносяць вялікую шкоду рэвалюцыйнаму тэатру. У расейскім тэатры вялікія спрэчкі і ажыўленьне—выклікалі дзьве пастаноўкі—«Любовь Яровая» і «Дні Турбіных». Гэта чуць ня першыя пастаноўкі, якія перайшлі ад ілюстрацыі тэзісаў да маляваньня жывых людзей. П'еса Грамыкі дае вялікі поступ наперад у гэтым жа напрамку ў белрускім тэатры. Кастрычнікавая рэвалюцыя адзначала зьмену аднае клясы другою,—моцнаю і жыцьцяздольнаю. Мастацкі твар на тэму аб Кастрычніку павінен быў у жывых вобразах паказаць гэту замену і падкрэсьліць яе гістарычную неабходнасьць. У п'есе Грамыкі перад намі праходзіць панская сям'я Барэновічаў, праходзіць яскрава і выразна, ва ўсіх сваіх падрабязнасьцях. На тэрасе старога дваранскага гнязда шыпіць астмічная гутарка старога пана Барэновіча, спраўніка, тыповыя вобразы дагніваючага фэадалізму, прасякнутыя пабудаваным на традыцыях п е р а к а н а н ь н е м у сваіх с і л а х — карыкатурныя і адначасна трагічныя прадстаўнікі ніэрынутай Кастрычнікам клясы. Тут і сын дваранскага гнязда, рыцар белага сьцягу Мікола Борэновіч і экзальтаваная дзяўчына Матюня; гэткія дзяўчаты ў свой час выракаліся сваёй белай тэрасы з калёнамі за шчасьце і гонар кінуць бомбу ў якога-небудзь губарнатара, ці паліцмэйстара—гэта народніца ў зачатку, у першай стадыі.

Наіўны Гэнадзі—непрактычны ідэаліст і, нарэшце Софі і Раіса—язвы на целе паміраючай клясы, прадвесьнікі непазбежнага яе канца, мікробы, якія руйнуюць арганізм, заражаючы яго псыхіку, яго мараль, яго звычаёвасьць. Новых людзей мала ў Грамыкі, гэта дзядзька Сысой, матрос Барына—і ўсё. Але шчыра і барвова адбіта ў п'есе Грамыкі маса, сялянская маса, якая рабіла рэвалюцыю на вёсцы. Гэта маса ўмее разабрацца, за кім праўда, умее знайсьці агульную мову і з наезьнікамі дзікай дывізіі, і з палішняю гразою рэвалюцыянэраў — данскімі казакамі. Яна ўмее адрозьніць меншавіка Лапцэвіча ад таварыша Станіслава, што з гораду, з заводу прыходзіць да яе, каб дапамагчы ў яе барацьбе; яна і сама навучылася фармуляваць свае права ў такія дні, калі старое права зьнішчана, а ва ўтварэньне новага яшчэ ніхто ня ўзяўся.

Вартасьць Грамыкавай п'есы бадай што ня зьменшылася-б, каб ён, заместа п'есы, даў гістарычную хроніку таго часу. На наш погляд Грамыка даў тое, што патрэбна: даў рух часу ў жывых вобразах. Большага ад аўтара ніхто вымагаць ня можа. Да загалаў п'есы адносіцца залішні рыторызм у некаторых мясьцінах, што варта было-б згладзіць: усе тэарэтычныя спрэчкі можна было-б даць у больш жывой форме, такім чынам, ух'кнуць нудных дыспутатаў на палітычныя тэмы.

Трэба адзначыць яшчэ некаторую псыхалёгічную схематычнасьць і сантымэнтальнасьць у адносінах паміж Манюняю і Барыкай.

Ёсьць яшчэ паасобныя дробныя недахваты, але яны, ў канцы канцоў, не зацямняюць агульнага фону дзеі.

У адносінах да пастаноўкі мы павінны надкрэсьліць, што БДТ2 сябе апраўдаў. Знойдуцца, бязумоўна, рэцэнзэнты, якія не абмінуць, каб лішні раз ня выліць памыяў на маладых беларускіх артыстаў, але ці варта зьвяртаць увагу на гэткіх «аднакапытых». Найлепей справіліся з сваімі ролямі Ільлінскі (Сысой), Станюта (Манюня), Рагавенка (ударнік) і Сяргейчык (стары Борэновіч), Вашкевіч (Софі), Шынко («Раіса) і Скальскі (Мікола) таксама вельмі добра выканалі свае ролі.

Неспадзявана для нас вяважна правяла сваю ролю Бандарчык (Тацяна). Рэшта артыстаў шмат зрабілі для таго, каб узьняць рэпутацыю свайго маладога тэатру. Нам вельмі цяжка знайсьці заганы ў выкананьні артыстамі сваіх роляў, але, судзячы па агульнай кампазіцыі, і, нават, па настрою публікі, мы лічым, што артысты БДТ 2 цалкам апраўдываюць надзеі, якія на іх ускладаліся падчас іх вучобы.

Ня зусім добрае ўражаньне на гледачоў зрабіла бязьмернае кручэньне сцэны. Як кажуць—«ударь раз, ударь два, но нельзя же до безчувствия». І гэта на далейшы час варта было-б прыняць пад увагу самім артыстам БДТ2, якім, мабыць, таксама не да смаку прышлося гэта нясупынная карусэль.

Наогул-жа, пастаноўка «Каля тэрасы» пакідае самае найлепшае ўражаньне на гледача і зьяўляецца на наш погляд, адным з багацейшых укладаў у скарбніцу беларускага тэатру.

ТОДАР ГЛЫБОЦКІ.

1-я ўсебеларуская нарада працаўнікоў мясцовай прамысловасьці.

5-га сьнежня ў Менску адчынілася 1-я ўсебеларуская нарада працаўнікоў мясцовай прамысловасьці, склікаеая аддзелам мясцовай прамысловасьці ВСНГБ.

Аб стане і пэрспэктывах разьвіцьця

мясцовай прамысловасьці зрабіў даклад старшыня ВСНГ тав. Карп, які зазначыў, што ў беларускіх умовах мясцовая прамысловасьць надпарадкавана АВК-м і РВК.

Па каштоўнасьці свае прадукцыі мясцовая прамысловасьць займае 20 пр. у агульнай сыстэме цэнзавай прамысловасьці. Першае месца ў сыстэме мясцовай прамысловасьці займаюць працкалектывы, кошт прадукцыі якіх дасягае паўтара мільёнаў р.

Па вестках НК Працы, у бягучым гаспадарчым годзе ва ўсіх прамысловых прадпрыемствах будзе занята звыш 5000 рабочых. Мясцовая прамысловасьць мае 680 харчавых прадпрыемстваў, 38 сілікатных, 38 па апрацоўцы прадуктаў з жывёлы, 34 камунальна-абслугоўваючых, 30 дрэваапрацовачных і інш.

Капітальнае будаўніцтва,

зьвязанае з аднаўленьнем прамысловых прадпрыемстваў, спачатку ня было плянавым. Часта будаваліся прадпрыемствы бяз вучоту фінансавых магчымасьцяў і пэрспэктыў разьвіцьця.

На капітальнае будаўніцтва ў 1925-26 годзе было затрачана 2 з паловай мільёны рублёў, прычым 54 пр. гэтай сумы пайшло на электрабудаўніцтва.

Выдаткі на капітальнае будаўніцтва ў 1926-27 годзе дасягнулі 3 з паловай мільёнаў руб., што ў параўнаньні з папярэднім годам дало павялічэньне на 33 проц.

На капітальнае будаўніцтва мясцовай прамысловасьці ў 1927-28 годзе Дзяржплян вызначыў звыш 5 мільёнаў руб.

Фінансавае становішча

У сувязі з бясплянавасьцю капітальнага будаўніцтва да гэтага часу застаецца цяжкім.

Па вестках Дзяржпляну зваротныя сродкі мясцовай прамысловасьці павінны былі скласьці 2 мільёны рублёў, а на справе аказалася, што гэтых сродкаў ёсьць толькі 600.000 р. і то ўкладзеных у матар'ялы, якія не паддаюцца рэалізацыі.

Як наладзіць працу мясцовай прамысловасьці.

Каб мясцовая прамысловасьць магла разьвівацца далей і каб яе працу ўвязаць з працаю рэспубліканскай прамысловасьці, неабходна ў бліжэйшы час аформіць арганізацыю інспэкцый мясцовай прамысловасьці ў акругах і надмацаваць іх адпаведнымі кадрамі работнікаў.

Трэба, каб прадпрыемствы мясцовай прамысловасьці пры складаньні кантрольных лічбаў і вытворчых праграм кіраваліся патрэбамі мясцовага рынку і наліччам мясцовай сыравіны. Апроч гэтага, пляны неабходна абавязкова ўвязваць з агульным прамысловым плянам Беларускай рэспублікі.

Для палепшаньня фінансавага становішча мясцовай прамысловасьці неабходна дабіцца доўгатэрміновага крэдытаваньня ў суме ня менш мільёна рублёў.

З арэнднага карыстаньня трэба ўзяць усе тыя прадпрыемствы, якія зьяўляюцца найбольш даходнымі і добра абсталёванымі.

С. Аз.

Сродкі на прамысловасьць у 1927-28 г.

Дзяржава, зьбіраючы праз падаткі сродкі, частку іх аддае прамысловасьці. Частка выдаткаў на прамысловасьць у бюджэце бязупынна павялічваецца. Павялічваецца яна і ў 1927-28 годзе. Так, калі ў мінулым 1926-27 г. выдаткі на прамысловасьць па ўсяму СССР складалі 10 проц. усіх выдаткаў, дык у 1927-28 г. яны складаюць ужо 10,4 проц. Іншымі словамі, больш адной дзесятай часткі дзяржаўных сродкаў ідзе на разьвіцьцё прамысловасьці. Выдаткі на прамысловасьць павінны скласьці ў 1927-28 г. 590 млн. руб., супроць 503 млн. руб. у мінулым годзе, г. зн. павялічацца на 17 з лішнім процантаў.

Па свайму характару выдаткі на прамысловасьць у бягучым годзе значна адрозьніваюцца ад выдаткаў папярэдніх гадоў, асабліва пэрыяду да 1925-26 году. Выдаткі мінулых год ішлі пераважна на павялічэньне зваротных капіталаў прамысловых прадпрыемстваў. Гэта тлумачыцца тым, што прамысловасьць, маючы асноўны капітал: будынкі, варштаты, пад'язныя шляхі і г. д., ня мела сродкаў для набыцьця сыравіны, найму рабочай сілы, г. зн., зваротнага капіталу. Але зараз прамысловасьць яго ўжо мае, і перад ёю пастала задача пашырэньня капітальнага пераабсталяваньня. Неабходна будаваць новыя заводы і фабрыкі, пашырыць старыя, замяняць старыя зношаныя варштаты новымі, паравыя рухавікі замяняць электрычнымі і г. д.

Другой характэрнай рысай укладаньняў гэтага году, а таксама і наступных, зьяўляецца тое, што галоўная ўвага аддаецца цяжкай прамысловасьці, мэталюргічнай, горнай і г. д. Гэта асаблівасьць абумоўлена тым, што разьвіцьцё ўсёй нашай прамысловасьці залежыць ад таго, ці здолеем мы выпрацоўваць неабходную колькасьць машын і варштатаў. Толькі пры ўмовах разьвіцьця ўласнага вырабу абсталяваньня мы зможам вызваліцца ад залежнасьці ад замежных капіталістаў. Калі мы ня будзем самі выпрацоўваць машыны, дык іх прыдзецца заўсёды ўвозіць з-за межаў, заўсёды быць залежнымі.

Укладаньне ў прамысловасьць 590 млн. руб., якія ідуць па адзначаных лініях, зьвязана таксама з правядзеньнем рацыяналізацыі вытворчасьці, г. зн., з лепшым выкарыстаньнем абсталяваньня, скарачэньнем выдаткаў на перамяшчэньне матар'ялаў у вытворчасьці, поўнай нагрузкай рабочага дню і г. д. Усё гэта дае магчымасьць значна павялічыць выпрацоўку вырабаў прамысловасьці і зьнізіць іх сабекошт. Урад СССР ухваліў зьнізіць сёлета сабекошт вырабаў прамысловасьці на 6 проц., што дасьць магчымасьць зьнізіць і розьнічныя цэны на іх.

Урэшце, неабходна сказаць, што павялічэньне выдаткаў на прамысловасьць ідзе не за кошт скарачэньня выдаткаў на сельскую гаспадарку і іншыя патрэбы нашай краіны. Павялічэньне гэтых выдаткаў праходзіць за кошт росту дзяржбюджэту і за кошт скарачэньня адміністрацыйных выдаткаў. Чым больш настойліва будзе праводзіцца рэжым эканоміі ў дзяржапараце, тым шпарчэй будзе расьці наша прамысловасьць.

Я. С.

Чарговыя задачы сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту БССР.

Сельская гаспадарка заканчвае свой працэс аднаўленьня і ўступае ў фазу далейшага разьвіцьця. У зьвязку з гэтым павялічваецца роля сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту ў сэнсе яго ўплыву на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і на яе далейшы напрамак. Гэта ставіць перад сыстэмаю сельска-гаспадарчага крэдыту задачу рашучага праводжаньня нашага камуністычнага напрамку:

а) умацніць і некалькі пашырыць у нізавой крэдытна-каапэрацыйнай сетцы, а значыць і павялічыць выдачу сродкаў на пазыкі, на асноўныя і спэцыяльныя капіталы нізавой сеткі;

б) значна пашырыць крэдытаваньне сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі — калектыўных гаспадарак, камун і савецкіх гаспадарак;

в) павялічыць крэдытаваньне сыравінных і экспортных культур і галін;

г) значна пашырыць доўгатэрміновае крэдытаваньне згодна дырэктыў апошняга пленуму ЦВ УсеКП(б) і XI зьезду нашай камуністычнай партыі Беларусі;

д) пашырыць крэдытаваньне мерапрыемстваў па будаўніцтву і абсталяваньню прадпрыемстваў, па перапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі, па сельскай электрыфікацыі, якая мае прамысловае значэньне, і па дастаўцы сельска-гаспадарчых машын.

У аснову павінна быць пакладзена пытаньне аб правільным сацыяльным накіраваньні сельска-гаспадарчага крэдыту ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі на мясцох, асабліва ў нашай нізоўцы. У якасьці аб'екта крэдытаваньня павінны быць узяты выключна бядняцка-серадняцкія сялянскія гаспадаркі. Крэдытаваньне бядняцкіх сялянскіх гаспадарак павінна быць значна павялічана. Кулацкія гушчы сялянскіх гаспадарак не павінны карыстацца крэдытамі сыстэмы с.-г. крэдыту.

Гэты агульны напрамак крэдытнай палітыкі на гэты год павінен быць цалкам і поўнасьцю ажыцьцёўлены па ўсёй нашай сыстэме с.-г. крэдыту, як на акруговых таварыствах с.-г. крэдыту, так і нізавой пэрыфэрыі, што выконваецца Белсельбанкам з першага кварталу 1927-28 апэрацыйнага году.

У разьвіцьцё гэтага ў першую чаргу неабходна мабілізаваць у гэтым напрамку сілы і сродкі самой сеткі с.-г. крэдытных установаў па ўсіх зьвеньнях усёй тэрыторыі БССР.

Трэба распачаць актыўную энэргічную кампанію за своечасны зварот пазык з боку сялян, дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый, адначасна прыстасоўваючы і ажыцьцяўляючы на мясцох маніфэст 2-й сэсіі ЦВК СССР аб вызваленьні ад нядоімак і звароту пазык на розных стыхійных навалах, прадугледжаных законам нашага беларускага ўраду.

Належыць значна пашырыць і паглыбіць мерапрыемствы па прыцягненьні вольных сродкаў жыхарства, грамадзкіх дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый усімі спосабамі, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на прыцягненьне гэтых сродкаў ад сялянства ў форме ашчаднасьці ў пашу нізавую сетку і ў форме перадачы с.-г. крэдытнаму таварыству с.-г. прадукцыі для рэалізацыі на каапэрацыйна-камісійных асновах.

Роля і значэньне кожнага сельска-гаспадарчага крэдытнага таварыства будзе расьці і разьвівацца адпаведна росту яго камісійных зьбыта-дастаўчых апэрацый і разьвіцьцю банкаўскіх яго функцый, а разам з ростам пачатковага зьвяна будзе расьці і магутнасьць усёй сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту.

Адпаведна таму, наколькі нашай сыстэме ўдасца такім чынам скарачаць дзяржаўную грашовую эмісію, якая патрэбна была да гэтага часу для аплаты селяніну за збыт прадукцыі, сельская гаспадарка можа з поўнаю п а д с т а в а ю разьлічваць на дадатковы прыток дзяржаўных сродкаў для выкананьня фінансавых вытворчых патрэб.

Паваротны момант у эканамічных задачах па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і новыя гаспадарча-эканамічныя мэтады па разьвіцьці вытворчых сіл сельскай гаспадаркі няўхільна патрабуюць новых шляхоў і ў крэдытнай палітыцы. Асноўныя капіталы, укладзеныя ў сельскую гаспадарку да рэвалюцыі, да гэтага моманту ў агульным адноўлены. Далейшы рост сельскай гаспадаркі БССР мае непасрэдную залежнасьць ад далейшых укладаў у асноўныя вытворчыя затраты. Адгэтуль выплывае рашучая неабходнасьць павялічыць долю доўгатэрміновых крэдытаў. Сёлета ў кожным разе павінна быць накіравана ў доўгатэрміновае крэдытаваньне ня менш 60 проц. асноўнага капіталу па таварыствах с.-г. крэдыту і ня менш 75 проц. асноўнага капіталу Белсельбанку.

На сыстэме с.-г. крэдыту ляжыць асабліва важная задача крэдытаваньня асноўных затрат сельскай гаспадаркі, пазык для капітальнага будаўніцтва і ўсе гэтыя крэдыты маюць пэўна выяўлены вытворчы характар; больш таго, трэба ўзмацніць гэта вытворчае імкненьне да мэты.

Паколькі даставачныя, загатовачныя і зьбытавыя патрэбы сельскай гаспадаркі могуць здаволіцца з іншых крэдытных крыніц, наша крэдытная сыстэма дзеля арганізаванага і плянавага прыцягненьня гэтых сродак для сельскай гаспадаркі з іншых крэдытных сыстэм не павінна раскідаць сваіх сродкаў, а імкнуцца, праводзячы гэта прыцягненьне сродкаў праз сябе за кошт сваіх сродкаў, яскрава выявіць сябе ў шырокай сфэры, імення ў вытворчай дзейнасьці сельскай гаспадаркі.

У зьвязку з агульнымі народна-гаспадарчымі праблемамі, максымальнага здаваленьня попыту ўнутранага рынку на с.-г. прадукцыю; фарсіраваньне вытворчасьці сыравіны і тэхнічных культур як для прамысловасьці СССР, так і для экспорту; паслабленьня аграрнай перанаселенасьці ў асобных раёнах і зьвязанага з ёю беспрацоўя і, нарэшце, у зьвязку з задачаю барацьбы з кулацтвам і неабходнасьцю ўздыму матар'яльна-гаспадарчага ўзроўню бядняцкіх і серадняцкіх гушчаў сялянскага жыхарства,—сыстэма с.-г. крэдыту павінна выявіць свой рашучы і актыўны ўплыў у гэтай клясавай барацьбе з кулацкімі тэндэнцыямі.

Пераважнаму крэдытаваньню на набыцьцё с.-г. машын і прыладаў падлягаюць сялянскія вытворчыя аб'яднаньні (калектыўныя гаспадаркі, машынныя таварыствы, і інш.), а таксама с.-г. крэдытаваньня т-вы якія маюць пракатныя пункты, прычым, як тыя, так і другія—з бядняцка-серадняцкім складам. Крэдыты на набыцьцё складаных с.-г. машын павінны давацца таксама пераважна, а трактары—выключна пералічаным вышэй сялянскім аб'яднаньням.

Поруч з крэдытаваньнем памянёных сялянскіх аб'яднаньняў павінны надавацца крэдыты на набыцьцё с.-г. машын і прыладаў як каапэраваным, так і некаапэраваным асобным бядняцка-серадняцкім сялянскім гаспадаркам; з мэтаю стымуляваць каапэраваньне сялянскіх гаспадарак пераважнаму крэдытаваньню падлягаюць каапэраваныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі пры роўным іх маемасным становішчы з некаапэраванымі сялянскімі гаспадаркамі. Каб павялічыць крэдытаваньне беднаты, некаапэраваныя бядняцкія сялянскія гаспадаркі падлягаюць пераважнаму крэдытаваньню перад іншымі маемаснымі групамі сялянскіх гаспадарак, хоць-бы і каапэраванымі.

Пры крэдытаваньні дастаўкі с.-г. машын неабходна праводзіць прынцып дэцэнтралізаванага выкарыстаньня цэлявых крэдытаў на дастаўку с.-г. машын, шляхам непасрэднага крэдытаваньня праз с.-г. крэдытныя таварыствы пакупцоў с-г. машын і прылад у формах, забясьпечваючых як мэтавае выкарыстаньне і своечасны зварот пазык, так і правільнае сацыяльнае накіраваньне крэдыту.

Поруч з крэдытаваньнем асноўных капіталаў каапэрацыйных і сялянскіх гаспадарак пачынае набываць вялікае значэньне і фінасаваньне зьбыта-загатоўчых апэрацый, аб чым сьведчыць рост вучотна-вэксэльных апэрацый нашага банку. Неабходна і тут не абмяжоўвацца толькі накіраваньнем крэдыту, а сурова сачыць і за назначэньнем яго, для чаго ў выкананьні крэдытнага пляну адбіваць ахват крэдытам асноўных таварных галін сельскай гаспадаркі.

Аддаць больш увагі с.-г. прамысловасьці, асабліва апрацоўцы тэхнічных культур і прадуктаў жывёлагадоўлі.

Тэрміны крэдытаў неабходна пагоджваць з абаротамі капіталаў у данай галіне, што толькі павялічыць крэдытную дысцыпліну нізавой сеткі і забясьпечыць правільнае выкарыстаньне крэдыту, а таксама і пастаўленыя перад намі задачы нашай камуністычнай партыі, дадзеныя пастановаю XI зьезду КПБ у галіне сыстэмы с.-г. крэдыту ў БССР.

А. Дубіна.

Чарговыя задачы сацыяльнага забясьпечаньня.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам Нар. Камісар Сацыяльнай Забясьпекі т. Калінін паведаміў аб мерапрыемствах, якія маюць быць праведзены ў галіне сацыяльнага забясьпечаньня насельніцтва. Ужо распачалася падрыхтоўчая праца да Забясьпечаньня старых сялян-беднякоў згодна маніфэсту ўраду СССР. Урад БССР даў заданьне Наркамфіну і Нар. Кам. Сац. забясьпекі распрацаваць адносна гэтага закон. Органы Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі ужо распачынаюць на мясцох вучот старыкоўсялян, якіх трэба ўзяць на дзяржаўнае забесьпячэньне.

У адносінах да інвалідаў вайны і семяў забітых у сёлетнім годзе ёсьць намер павысіць самую пэнсію і пашырыць кантынгент пэнсіянэраў. Наогул, пэнсія мае павялічыцца на 20 проц.. а кантынгент пэнсіянэраў—на 100 проц. Пэнсію будуць атрымліваць каля 10 тысяч чалавек, на што мяркуецца выдаць звыш мільёна руб.

Праводзіцца значная праца ў галіне перакваліфікацыі інвалідаў. Штогод у майстэрні інвалідная каапэрацыі ўцягваюцца новыя кадры інвалідаў, якія навучаюцца там рамяству.

Адным з прыкрых зьявішчаў нашае сучаснасьці зьяўляецца жабрацтва: па прыблізных даных, у межах БССР знаходзіцца каля 10 тысяч жабракоў.

Праўда, у нас існуюць гарадзкія і мястэчковыя к-ты ўзаемадапамогі, але яны далёка не спраўляюцца з сваёй задачай. Барацьба з жабрацтвам павінна прыняць у нас масавы, народны характар. Для барацьбы з жабрацтвам неабходна ўтварыць грамадзкую арганізацыю па прыкладу існуючых арганізацый МОПР, ОСО-Авіяхім і інш.

Членамі такога т-ва павінны быць усе рабочыя, сяляне і служачыя. Тут-жа, над бокам, маса жарбацтва, беднасьці, а грамадзкасьць чакае, што з гэтай нядоляй могуць справіцца толькі адны к-ты. Вось чаму вакол пытаньня барацьбы з жарбацтвам неабходна згуртаваць грамадзкую думку.

Некальні слоў аб дамох для інвалідаў. У БССР ёсьць 20 гэткіх дамоў, у якіх знаходзіцца да 800 утрыманцаў: 600 старыкоў і каля 200 інвалідаў вайны. У бягучым годзе ёсьць намер адчыніць адзін дом для інвалідаў у Гомелі на 50 ложкаў.

Зводка № 5
наступленьняў с-г. падатку кампаніі 1927-1928 году.

За час з пачатку кампаніі да 1-га сьнежня.

Акругі	Наступіла: Акладу	Нядоімкі	Пені	Усяго	Проц. выпаўненьня гадавога заданьня
Полацкая	277.440	3.649	2.652	283.741	44,9
Мазырская	296.802	3.376	1.399	301.577	42,3
Магілеўская	671.706	14.969	4.604	691.279	42,4
Бабруйская	680.201	15.255	5.658	701.114	41,9
Віцебская	437.161	7.105	3.282	447.548	41,5
Аршанская	440.728	11.592	5.058	457.378	41,0
Менская	703.904	18.500	8.245	730.649	39,0
Гомельская	428.812	12.688	4.696	446.196	36,9
Агулам	3.936.754	87.134	35.594	4.059.482	40,9

Вёска сёньня.

Беднякі ад падатку вызвалены ўсе.

На маніфэсту з прычыны 10-ай гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, на наш сельсавет дадаткова было адпушчана 500 рублёў для скідкі падатку з бяднейшых сялянскіх гаспадарак.

Камісія ў прысутнасьці беднякоў, працу скончыла.

У выніку—усе гаспадары, якія маюць адну карову і аднаго каня (тым, якія маюць адну карову, падатак быў скінут раней) звольнены ад падатку на 100 проц.

Шмат менш заможных гаспадароў, якія маюць дзьвюх кароў і аднаго каня, таксама атрымалі скідку, некаторыя—на 100 проц., некаторыя—на 50 проц. Аддавалася ўвага тым, хто нядаўна земляўпарадкаваны.

Заможныя крычалі:

«І нам трэба скінуць, хоць капейку, каб і мы ведалі маніфэст»!

Праводзілася строга клясавая лінія. Беднякі задаволены. **А. М-кі.**

Вобальскі с.-с. Полаччына.

Хто вінаваты?

У часе вучоту аб'ектаў ападаткаваньня ў нас у в. Рудня-Альхоўка ўся праца па вучоту праводзілася скрытым парадкам. Вынікі вучоту вучотная камісія на агульным сходзе не абвяшчала, што згодна закону неабходна было зрабіць. А таму, калі пасьля вучоту атрыманы былі акладныя лісты, выявілася шмат несправядлівасьцяў. Напрыклад, па нашай вёсцы было прыпісана лішняй жывёлы 51 штука. Атрымаўшыя акладныя лісты сяляне вельмі былі зьдзіўлены, адкуль гэта ўзялася ў іх лішняя жывёла.

Яны падалі заявы ў раённую падатковую камісію, каб яна зьняла з вучоту лішне прыпісаную жывёлу. Праўдзівасьць гэтых заяў была сьцьверджана сельсаветам. Заявы былі пададзены яшчэ ў ліпені г. г., і толькі праз 4 месяцы—12 лістапада РВК даў адказ на гэтыя заявы, што яны беспадстаўныя, але чаму беспадстаўныя, аб гэтым РВК нічога не сказаў.

Тады сяляне пачалі крычаць: «за што-ж мы будзем плаціць лішняе, калі ў нас гэтага няма».

Дзяніс Духвалаў.

Уваравіцкі р., Гомельшчына.

Будуем лепшае жыцьцё.

За апошнія гады і асабліва сёлета справа гаспадарчага будаўніцтва на новых рэйках, на калектыўных пачатках значна пасунулася ўперад.

Зараз па тэрыторыі сельсавету разгарнулі сваю працу шмат відаў розных каапэрацыяў. Спажывецкай каапэрацыяй ахоплена звыш 80 проц. усяго насельніцтва, а таксама значны процант сялянства ахоплен і сельска-гаспадарчай каапэрацыяй. Асабліва разьвіцьцё атрымалі спэцыяльныя віды каапэрацыі. Агнятрывалае тарпяное таварыства яднае да 400 пайшчыкаў—за лета здабыло 150 кубічных сажняў торфу, выпрацавала шмат кругоў для студняў, чарапіцы і інш.

І ўжо шмат дзе можна бачыць чарапічныя стрэхі. Ёсьць яшчэ і насеннае таварыства, яднаючае да 50 пайшчыкаў, якое дабілася значных посьпехаў у галіне разьвядзеньня заводнага збожжа, як аўса «Перамога»—«Залаты дождж», ячменю—«Прынцэса», заводзкага жыта і інш. Значныя посьпехі мае і малочнае таварыства. Некаторыя вёскі, як Яркова, Буцаўшчына, Дзехцяроўка і інш. млека сваё гады ўжо са два збываюць калектыўным парадкам. Адно дрэнна, што з боку вышэйшых устаноў спэцыяльным таварыствам, як насеннаму і малочнаму не даецца ніякай кіруючай падмогі, ніхто ніколі ня бачыць агранома, што бязумоўна зьяўляецца вялікім недахватам. Пасёлкаў у сельсавеце зараз налічваецца каля 20 і ўся галоўная ўвага аддаецца ў першую чаргу беднаце і пасёлачнікам. Сёлета сярод пасёлачнікаў разьмяркована больш як на 1200 рублёў крэдытнага і дарэмнага дрэва, а таксама каля 100 беднякоў і пасёлачнікаў зусім вызвалены ад с.-г. падатку. Так разгортвае працу Ратамскі с.-савет па гаспадарчаму адбудаваньню—**недалёка ад закардоннай Беларусі.** **С.**

Заслаўскі р., Меншчына

Хочам гаспадарыць пакультурнаму.

Дайце сельска-гаспадарчыя веды.

У нашым Бабаўнянскім сельсавеце налічваецца прыблізна да 1000 двароў. Большая частка з іх складаюць вёскі вялікія (да 100 двароў) і мучацца яны ад церазпалосіцы і далёка-зямельля. Усе яны вядуць трохпольную гаспадарку.

Надта цяжкае становішча пры такіх умовах гаспадараньня, больш усяго прыкмячаецца ў пастаянных гутарках аб сельскай гаспадарцы і пажаданьні сялян пакінуць дзедаўскі спосаб землякарыстаньня і перайсьці да новага, болей карыснага.

—Але што-ж—гавораць сяляне—адказацца ад дзедаўскага землякарыстаньня ня штука.

— Галоўнае, як увесьці новы спосаб вядзеньня гаспадаркі.

—Каб нашу гаспадарку паставіць добра, то для гэтага патрэбна сельска-гаспадарчыя веды. Але, каб іх дзе атрымаць, каб хто хацеў, то няма дзе.

Сельска-гаспадарчыя гурткі ў вёсках—іх напершаму мала, а калі дзе і ёсьць, то праца ў іх не вядзецца, адным словам сельска-гаспадарчыя гурткі сьпяць. Узяць бы хоць да прыкладу в. Восава, якая мае сельска-гаспадарчы гурток, але які не працуе за недахватам сельска-гаспадарчае літаратуры і за адсутнасьцю агранома.

Такіх прыкладаў па нашым Бабаўнянскім сельсавеце досыць, якія сьведчаць, што па нашым сельсавеце яшчэ ня досыць разгорнута праца па правядзеньню сельска-гаспадарчых ведаў сярод сялян на што ў будучым трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Пара ўжо прабудзіцца і даць сялянам сельска-гаспадарчыя веды.

Вандроўнік.

В. Восава, Капыльскі р.

Становішча паштовай сувязі.

У апошні час зусім умацавалася сувязь праз лістаносцаў, у выніку чаго павялічылася выпіска пэрыядычнай літаратуры сялянамі, а іменна. у мінулым годзе на 5-6 двароў выпісвалася адна газэта, цяпер кожныя тры двары выпісваюць адну газэту. Зараз кальцавой поштай абслугоўваецца 95 проц. населеных пунктаў. Лістаносцы карыстаюцца сярод сялянства належным аўтарытэтам.

Раней сельсаветы толькі фармальна слухалі справаздачы лістаносцаў На будучы час неабходна часьцей ставіць справаздачы лістаносцаў, даваць практычныя дырэктывы ў іх працы, у прыватнасьці трэба больш уцягваць лістаносцаў у грамадзкую працу на вёсцы і выкарыстоўваць іх у большай меры для зьбіраньня зьберажэньняў у касы ашчаднасьці. **Сухараў.**

Бабруйскі раён

ТЭАТР-КІНО.

Кіно-тэатр «Культура»	З аўторка, 6 сьнежня, мастацкі баявік вытворчасьці Савкіно. „ПУРГА“. Драма ў 7 часьцях.
Кіно „Чырвоная зорка“.	Сусьветная фільма „ПАРИЖАНКА“. Маст. драма ў 8 часьцях.)—(Штодня—4 сэансы.)—(
Кіно «Пралетары».	З аўторка, 6 сьнежня—2-я і апошняя сэрыя „ЧЕРНЫЙ КОНВЕРТ“. ШТОДЗЁННА 4 СЭАНСЫ.
Кіно „Інтэрнацыянал“.	З аўторка, 6 сьнежня. „ЧЕЛОВЕК ИЗ РЕСТОРАНА“. У гал. ролі—заслуж. артыст М. А. Чэхаў.

АГРОНОМИЧЕСКОЕ БЮРО
Московского Общества Сельского Хозяйства предлагает к сезону 1928 года СЕМЕНА: трав, огородные, цветочные и полевые испытанной всхожести и чистосортности.
Полный каталог бесплатно по требованию.
Адрес: Москва, Смоленский Бульвар, д. 8.

Галоўлітбел № 2468.

Хроніка.

Ажыцьцяўленьне маніфэсту ўраду СССР.

З МЕНСКАГА ПАПРАЎЧАГА ДОМУ ВЫЗВАЛЕНА 394 ЧАЛ.

Да 5-га сьнежня з менскага папраўчага дому вызволена—394 чал. Скарочан тэрмін зьняволеньня напалову—256 чал; на трэць 36 ч.

Усяго амністыя ахапіла 686 ч.

9 год ЛКСМБ.

15 сьнежня ЛКСМБ будзе сьвяткаваць 9 год свайго існаваньня.

ЦК ЛКСМБ разаслаў усім акруговым арганізацыям ліст аб правядзеньні вечароў і ўрачыстых сходаў з пастаноўкай дакладаў аб асноўных этапах і задачах ЛКСМБ.

ЛКСМБ на 1-га кастрычніка г.г. налічваў 60932 чалавекі.

Павялічэньне крэдытаў для БССР.

Крэдытны плян Беларускай канторы Дзяржбанку на першы квартал зацьверджан у суме 25 мільёнаў рублёў, з выкарыстаньнем 96 проц. гэтай сумы. У мінулым годзе плян 1-га кварталу складаўся з 17.240.000 руб.

Па пляну галоўныя крэдыты вызначаны: Лесбелу—9.000.000 руб., спажывецкай каапэрацыі—3.350.000 руб., хімічнай прамысловасьці—1.750.000 руб. і мэталургічнай—1.715.000 руб.

КУТОК НЯКРАНУТАЙ ПРЫРОДЫ.

У вярхоўі р. Бярозы знаходзіцца дзяржаўны заказьнік, які займае больш 50 тысяч гэкт. У гэтым заказьніку знаходзіцца значны пляц някранутага лесу, вельмі цікавыя і добра захаваныя экзэмпляры беларускай флёры; тут-жа ёсьць ласі, мядзьведзі, бабры і інш. жывёла. Аддзел прыроды і гаспадаркі ўзьнімае пытаньне аб перадачы гэтага запаведніку ў карыстаньне ІБК.

НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ.

У новых межах Меншчыны існуе 6 нацсаветаў, з якіх 2 яўрэйскія мястэчковыя саветы і 4 польскія сельсаветы. Зараз вывучаецца пытаньне аб арганізацыі ў часе перавыбараў новых саветаў.

ЮРЫДЫЧНАЯ ДАПАМОГА СЯЛЯНСТВУ.

Пры Менскай акруговай зямельнай камісіі арганізавана кансультацыя юрыстаў з мэтай дапамог сялянству ў юрыдычных пытаньнях. Па ўсіх справах, якія маюць зямельна-судовыя спрэчкі, складаюцца заявы, робіцца растлумачэньні, будзе давацца магчымым скарыстаць юрыстаў і г. д. Сяляне, якія маюць зямельныя вучасткі каля 5 дзесяцін, кансультацыяй будуць карыстацца дарэмна.

Пленум сэкцыі навуковых працаўнікоў.

На гэтых днях закончыўся пленум навуковых працаўнікоў БССР. Пленум заслухаў справаздачы бюро сэкцыі Наркамасьветы і аб дзейнасьці Беларускай Дзяржаўнай Бібліатэкі.

Курсы завочнага навучаньня.

Саюз працасьветы супольна з Наркамасьветы распрацоўвае пытаньне аб арганізацыі ў БССР аддзелу курсаў завочнага навучаньня для настаўніцтва. (Цэнтральныя курсы знаходзяцца ў Маскве). Курсы будуць пад ведамам Наркамасьветы.

Школьны перапіс адбудзецца 15-га сьнежня.

15 сьнежня ў БССР адбудзецца школьны перапіс. Да правядзеньня гэтага перапісу зараз ідзе шырокая падрыхтоўчая праца.

На мясцох перапіс будзе праведзен сіламі настаўніцтва і раённых статыстаў.

Пасылка хворых на зімовыя курорты.

Менская акруговая страхкаса атрымала 5 месцаў на зімовыя курорты Каўказу. Хворыя ўжо накіраваны на Каўказ.

Хутка будзе накіравана туды другая партыя хворых.

Утвараецца музэй прамысловасьці.

Прамысловая камісія Інбелкульту робіць захады да арганізацыі музэю прамысловасьці.

Асноваю для гэтага музэю зьявяцца экспанаты ўсебеларускай прамысловай выстаўкі, а таксама іншых прамысловых выставак.

У Менску маюць быць арганізаваны батанічны сад і заолёгічны парк.

Аддзел прыроды і гаспадаркі Інбелкульту ўзьняў пытаньне аб арганізацыі ў Менску батанічнага саду і заолёгічнага парку.

Барацьба са шкарлятынай.

Пры дапамозе спэцыяльных урачэбных атрадаў Беларускі Пастэраўскі Інстытут зараз праводзіць шырокую антышкарлятынную кампанію. Апошняя вядзецца на ўсіх акругах БССР.

У кастрычніку праз прыёмную ЦВК БССР прайшло каля 500 чал.

У кастрычніку праз прыёмную ЦВК БССР прайшло каля 500 чал. Большасьць з іх зьвярталася па справах аб лесапарубках.

30.000 руб. на барацьбу з беспрацоўем сярод моладзі.

Наркампрацы БССР мяркуе ў бягучым годзе адпусьціць 30.000 руб. на барацьбу з беспрацоўем сярод моладзі.

На гэтыя сродкі будуць арганізаваны вытворчыя майстэрні і вучнёўскія брыгады для беспрацоўнай моладзі.

На будаўнічых работах было занята 21.000 рабочых.

У мінулым годзе Біржы Працы Беларусі накіравалі на розныя будаўнічыя работы 21.000 чалавек беспрацоўных.

Рост пасеўнай плошчы.

У 1920 годзе пасеўная плошча ў Беларусі складалася з 1.400.000 дзесяцін; зараз яна дасягнула 2.696.000 дзес., што перавышае даваенную пасеўную плошчу на 496.000 дзес.

Грузазварот Менскіх чыгуначных станцый.

Увесь грузазварот на станцыях Менск МББ і Заходніх чыгунак у 1926-27 годзе даў наступныя лічбы: прывезена ў Менск розных грузаў 16.542.000 пуд., адпраўлена з Менску 1.759.000 пуд.

У параўнаньні з дарэвалюцыйным часам смертнасьць зьмяншаецца.

У 1904-8 годах на 1000 чал. у Менску памірала 28,7, у 1913 г.—22,8 чал., у 1923 г.—18,3 чал., у 1924 г.—17,5 чал., у 1925 г.—16,5 чал., а ў 1926 годзе сьмертнасьць зьнізілася да 15,7 на 1000 чал.

Пажар у Аб'яднанай Прафтэхшколе.

5-га сьнежня а 6-й гадзіне вечара у Аб'яднанай Прафтэхшколе здарыўся пажар: загарэлася сушыльня.

Пажарнай дружыне ўдалося пажар ліквідаваць.

Страты дасягаюць 300 рублёў. Прычына пажару ня высьветлена.

Колькі здарылася пажараў у кастрычніку.

У працягу кастрычніка па БССР здарылася 230 пажараў, з іх 5 у гарадох.

Страты жывёлы ў кастрычніку.

За кастрычнік у БССР у сельскіх мясцовасьцях прапала коняй і кароў—28681 шт.; па гэтым страхаваньні выплачана 96519 р. страхоўкі; у гарадох прапала—77 штук, выплачана страхоўкі 1813 руб.

СУД.

РАДЫЁ-АМАТАР.

Натан Гоман доўгі час сам ня ведаў, да чаго ён здольны. Гандляр—не гандляр, бо няма чым гандляваць; нэпман—ня нэпман, бо ня мае ніякай маемасьці; служачы—таксама ня служачы, бо добрыя людзі так ня служаць,—апошняе нават сам Гоман разумеў.

— Да чаго-ж, урэшце, я здольны?—пытаўся сам у сябе Гоман.

І доўгі час ён ня мог даць на гэта запытаньне адказу.

Некалькі «шчасьлівых» выпадкаў дапамаглі Гоману канчаткова акрэсьліць сваю спэцыяльнасьць: Гоман хутка пераканаўся, што ён—радыё-аматар.

Вось гэтыя выпадкі.

У 1926 і 1927 годзе Гоман займаў пасады: загадчыка мантажнага аддзяленьня агенцтва „Сувязь“ і ў таварыстве „Чырвонага Крыжу“—кіраўніка радыё-падсэкцыі. Пасады добрыя. Асабліва для 19-цігадовага Натана Гомана. Але што Гоману служба,—ён-жа сам разумеў, што ён—не для службы.

Аднак, карыстаючыся гэтым службовым становішчам, Гоман раздуў сваю сапраўдную спэцыяльнасьць радыё-аматара. Ён зрабіў дагаворы з Цэнтральным Домам Асьветы і ўзяў там 50 рублёў, з лябараторыяй неарганічнай хіміі БДУ і ўзяў 75 руб., з ЦП саюзу хімікаў, дзе ўзяў 556 рублёў. Дагаворы ён зрабіў на ўстаноўкі радыё-прыёмнікаў.

Як Гоман устанаўляў радыё-прыёмнікі ў гэтых установах, можна бачыць з наступнага:

Дагавор з ЦП саюзу хімікаў.

— Тут можна пацягнуць,—думаў Гоман.

Зрабіўшы ўмову, ён узяў 352 рублі задатку на закуп радыё-апаратуры. Час ішоў, а радыё-устаноўкі ня было. Гоман адгаварваўся тым, што памёр яго бацька, і ён ня мае часу вазіцца з радыё-прыёмнікамі. Бацька Гомана на судзе шчыра пратэставаў супроць таго, што сын пахаваў яго жывуцом.

Трохі пачакаўшы, Гоман прышоў у ЦП і абманам узяў яшчэ 140 рублёў на „выкуп радыё-апаратуры, якая прыбыла і няма за што яе выкупіць“. Такім-жа чынам Гоман узяў 64 руб. у фабкому фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна“. Адным словам, справа радыё-аматара Гомана пайшла, як па маслу, і ён... заехаў на лаўку падсудных.

Нарсуд 1-га вучастку гораду Менску прагаварыў Гомана на 2 гады і 2 месяцы зьняволеньня без суровага адмежаваньня. Дастасаваўшы амністыю ўраду СССР, суд зьменшыў кару Гоману да 1 году і 1 месяца. **С. Азерскі.**

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

ЗАБОЙЦА.

Грамадз. вёскі Груд, Пухавіцкага раёну, Уладзімер Шычка, на вечарынцы завёў сварку з-за дзяўчыны Ганчарык Тэклі з Дзяманам Ганчарыкам, прычым ударыў Ганчарыка ў жывот нажом, у выніку чаго апошні памёр. Менскі акруговы суд прыгаварыў Уладзімера Шычка на 7 год зьняволеньня, але на аснове амністыі ў адзнаку 10-й гадав. Кастрычніка, скараціў кару на палову.

Эканамічная хроніка.

Мэляса для дражджавых заводаў.

У сувязі з пераходам у бліжэйшым часе аднаго з дражджавых заводаў Белхарчтрэсту на выпрацоўку дражджэй з мэлясы, Управа прамтавараў Наркамгандлю СССР запрапанавала Цукратрэсту адпусьціць Белхарчу ў 27-28 г. 1.700 тон мэлясы з бліжэйшых да Беларусі цукровых заводаў.

Масла для БССР.

У лік пляновага завозу масла на 1-ы квартал 27-28 г. (7 тыс. пуд.) маскоўская кантора Белкаапсаюзу адпраўляе 2 вагоны масла на адрас каапэрацыйных арганізацый БССР.

Адначасова маскоўская кантора Белкаапсаюзу пагадзіла з Маслацэнтрам закупку 2 тыс. пуд. масла на Украіне, якое будзе адгружана ў БССР у працягу сьнежня г. г. Апошняя колькасьць масла будзе накіравана ў Менск—1000 пуд. і ў Віцебск і Гомель—па 500 пудоў.

За перавышэньне цэн—пад суд.

Гандлёва-каапэрацыйная сэкцыя Менгарсавету праверыла выкананьне прыватнымі гандлярамі г. Менску пастановы Наркамгандлю БССР аб цэнах на цукер і газу. У выніку аказалася, што прыватнікі значна перавышалі цэны на гэтыя тавары, а ўласна: гандляр Ніша (Маскоўская, 67) прадаваў цукер на 75 кап. за кілё, а гандляр Шышка—цукер-пясок на 62 к. за кілё, а газу,—на 12 кап. за літр і г. д.

Згодна пастановы гандлёва-каапэрац. сэкцыі, акруговы інспэктар гандлю па Менскай акрузе накіраваў акт праверкі акруговаму пракурору для прыцягненьня да адказнасьці 8 прыватных гандляроў.

1 КОПЕЙКА ЗА НОМЕР
1 РУБ. 50 КОП. за ГОД.
Допускается РАССРОЧКА ПЛАТЕЖА.

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1928 год на САМУЮ ДЕШЕВУЮ в СССР газету **„БАТРАК“**
газета ЦК союза сел.-хозяйств. и лесных рабочих СССР.
Выходит 3 раза в неделю.

БЕСПЛАТНЫЕ ПРЕМИИ. БЕСПЛАТНО будет разыграно 145 предметов на сумму в 2000 РУБЛЕЙ

В КАЖДОМ НОМЕРЕ газеты „БАТРАК“ ПОМЕЩАЮТСЯ:
1. Телеграммы и последние известия со всего света.
2. Корреспонденции о труде и быте батрачества, лесорубов, пастушества, совхозских и других сел.-хоз. и лесных рабочих.
3. Фельетоны, рассказы и очерки.
4. Статьи, освещающие жизнь союза сельхозлесрабочих.
5. Большой роман из современной жизни.
6. Рисунки, портреты и карикатуры.

Газета „БАТРАК“ СООБЩАЕТ ЧИТАТЕЛЯМ ВСЕ, ЧТО ИХ ИНТЕРЕСУЕТ.

Полугодовые подписчики получат бесплатно: „СПРАВОЧНИК БАТРАКА“—карманный календарь на 1928 год.

Годовые подписчики получат БЕСПЛАТНО 3 премии:
1. „СПРАВОЧНИК БАТРАКА“.
2. „ОТ РАБСТВА К СОВЕТАМ“—альбом из 16 картин по истории революционной борьбы крестьянской бедноты и батрачества.
3. „БАТРАЦКИЙ ПЕСЕННИК“.

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ (с пересылкой и доставкой):
150 номеров в год . . . . . 1 р. 50 коп.
75 номеров в 6 месяцев . . . — 75 „
за 3 месяца . . . . — 40 „
за 1 месяц . . . . — 15 „

ДОПУСКАЕТСЯ РАССРОЧКА ПЛАТЕЖА ГОДОВЫМ ПОДПИСЧИКАМ:
при подписке—50 коп., к 1 марта—50 коп. и 1 июля—50 копеек.

Подписчики за перемену адреса не платят.

Кроме того, все **годовые** и **полугодовые** подписчики получат **бесплатно билет на участие в розыгрыше следующих 145 предметов на сумму в 2000 рублей:**
1. 5 облигаций выигрышного займа индустриализации.
2. 5 охотничьих ружей.
3. 10 пар кожаных сапог.
4. 3 гармонии.
5. 5 карманных серебряных часов.
6. 2 самовара.
7. 5 полушубков.
8. 10 пар валенок.
9. 10 шерстяных полушалок.
10. 10 ватных жакетов.
11. 10 поперечных пил.
12. 25 топоров.
13. 10 теплых одеял.
14. 10 балалаек.
15. 10 пастушеских рожков.
16. 10 бритв.
17. 5 будильников.

РОЗЫГРЫШ БУДЕТ ПРОИЗВЕДЕН В МАРТЕ 1928 года.
О дне и порядке розыгрыша будет сообщено особо.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ:
1) в Главной Конторе Газеты «Батрак»;
2) во всех почтовых отделениях и у письмоносцев;
3) у сборщиков подписки при всех организациях союза **сельхозлесрабочих.**

Подписные деньги и заказы адресовать: Главная Контора газеты **„Батрак“**, Москва, Солянка, 12, Дворец Труда, комн. 222.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

„Электрычнае вока“.

Амэрыканскае ваеннае ведамства праводзіць вопыты з вынаходкай інжэнэра Бэрда—„электрычным вокам“, якое дае магчымасьць выкрываць на моры судны не зважаючы на самы густы туман. Прылада Бэрда накіроўвае ў належным напрамку пук радыёхваль. Калі на шляху гэтых хваль спаткаецца перашкода, напрыклад, корпус судна, дык прылада зараз-жа адказвае на гэта гукам, тон якога залежыць ад шчыльнасьці і велічыні спатканай перашкоды. Водлуг думкі амэрыканскіх вайсковых экспэртаў, прылада Бэрда зусім скасуе маскіроўку ваенных апэрацый пры дапамозе дымавых заслон.

Аўтаматычны ліхтаршчык.

Інжэнэры амэрыканскай гэнэральнай электрычнай кампаніі ўстанавілі ў горадзе Гленсфольсе (штат Нью-Ёрк) вопытную электра-устаноўку для аўтаматычнага гашэньня і запальваньня вулічнага сьвятла. У аснову ўстаноўкі пакладзен так званы, фотоэлемэнт—прылада,—якая пры дзённым сьвеце праводзіць электру, а ў пацёмках робіцца неправаднікам. З фотоэлемэнтам зьвязан выключацель, які пры змроку ўключае ўсё вулічнае электрычнае сьвятло і гасіць яго на золаку.

Устаноўка поўнасьцю аўтаматычная, не патрабуе нагляду чалавека і эканамічна рэнтабельна.

150 КІЛЁМЭТРАЎ У ГАДЗІНУ НА МАТОРНАЙ ЛОДЦЫ.

У Амэрыцы і Англіі маторная лодка ўсё больш і больш адваёўвае сабе месца як спартыўная прылада.

Мэханікі там б'юцца над яе ўдасканаленьнем. Нядаўна амэрыканскі вынаходца Вальш запрапанаваў новы тып маторнай лодкі, якая разьвівае хуткасьць да 150 кілёмэтраў у гадзіну.

Самая складаная машына ў сьвеце.

Велізарная машына для вытворчасьці бутэлек, устаноўленая нядаўна на адной з лёнданскіх гутаў, зьяўляецца самай вялікай у сьвеце. Машына ўяўляе сабой 15 аднолькавых мэханізмаў, умацаваных на агульным рухавым стале. Усе апэрацыі вырабу бутэлек робяцца аўтаматычна. Размеры машыны дзівяць сваёю грандыёзнасьцю. Папярочнік рухавога стала, на якім устаноўлены ўсе мэханізмы,—8 мэтраў.

Вышыня ўсёй машыны—5 мэтраў. Машына мае 40 тысяч часьцей.

Вытворчасьць машыны проста казачная. Машына працуе адначасна над 90 бутэлькамі. За двухзьменны дзень машына вырабляе 100 тысяч бутэлек.

Горад-сад.

За 12 кілёмэтраў ад Парыжу на квяцістым схіле ўзвышша Плесі-Робэнсон будуецца горад-сад, галоўнымі жыхарамі якога будуць францускія вучоныя, мастакі і пісьменьнікі. Пасёлак задуман у выглядзе велізарнага парку з радка пабудаваных двухпавярховымі дачамі. Ён будзе мець усе гарадзкія выгоды, трамвай, водаправод, каналізацыю, электру. У пасёлку будуць пабудаваны тэатры, кіно і г. д. Вялікае месца ў будучым горадзе адводзіцца спартыўным пляцоўкам, стадыёнам і басэйнам для купаньня. Горад будуецца таварыствам, у якое ўваходзяць прадстаўнікі францускай інтэлігенцыі. Галоўным пайшчыкам таварыства зьяўляецца францускі ўрад, які, клапочучыся аб павялічэньні жыхарства Францыі, згадзіўся даць фінансавую дапамогу таварыству на такой цікавай умове: большая частка жыхароў будучага гораду абавязана быць: шматсямейнай.

„Спаборніцтвы“ і „конкурсы“ на пушным рынку.

Ёсьць старая прыказка: „У сямі нянек дзіця бяз носу застаецца“, а ў адносінах загатоўцаў пушніны гэта значыць, што ні ў аднаго з іх ня будзе пушніны.

І гэта ўжо пацьвярджаецца, бо адзін загатоўца прытрымліваецца ўстаноўленых цэн і нічога ня мае, а другі парушае гэтыя цэны і нешта атрымлівае; а таму на рынку цэны на пушніну з кожным днём павышаюцца, бо прадаўцы арганізуюць «спаборніцтва» між загатоўцамі, а апошнія арганізуюць між сабой „конкурс“; у выніку—пушніна кудысь зьнікае, і нашы беларускія загатоўцы застануцца без яе, прычым экспортны плян знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Пытаньне надзвычайна сур'ёзнае, і Наркамгандлю БССР неабходна ўжыць рашучыя меры да ўрэгуляваньня пушнога рынку. Неабходна ўстанавіць такі модус загатоўкі, каб ніводзін загатоўца ня меў магчымасьці плаціць даражэй за другога.

Калі Белдзяржгандаль, каапэрацыя і паляўнічы саюз сапраўды будуць зацікаўлены ў посьпеху кампаніі пушных загатовак, калі загатоўцы адмовяцца ад жаданьня пераплачваць, то будзе надзея, што пушніна застанецца ў руках беларускіх загатоўцаў.

А пакуль што справа знаходзіцца ў дрэнным становішчы. У часе нарады па выкананьні экспортнага пляну Белдзяржгандаль скардзіўся, што ён пазбаўлен усякай магчымасьці весьці загатоўку пушніны і з прычыны таго, што некаторыя загатоўцы плацяць даражэй, рэшта загатоўцаў можа рабіць тое самае, і вынікі вельмі сумныя.

Пушніна—адзін з найбольш рэнтабельных відаў экспорту, і каапэрацыя павінна дапамагчы выкананьню экспортнага пляну.

Калі ў сучасны момант лён, ільнянае семя, скураная сыравіна і іншыя віды экспортных тавараў павінны быць здадзены ў першую чаргу мясцовай прамысловасьці, што і робіцца нават асноўным экспартэрам Беларусі—Белдзяржгандлем, дык пушніна, як чыста экспортны від тавару павінна быць сканцэнтравана ў руках Белдзяржгандлю для адсылкі заграніцу.

Наркамгандль БССР павінен дадаць на мясцох дырэктывы аб усялякай дапамозе Белдзяржгандлю, бо выкананьне экспортнага пляну па пушніне надзвычайна важнае і сур'ёзнае пытаньне.

Пры сучасным-жа становішчы на пушным рынку наўрад ці гэта ўдасца зрабіць.

А. Шапін.

Другі выпуск курсаў Наркамюсту.

Учора ў клюбе Савгандальслужачых адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае другому выпуску курсаў Наркамюсту.

Усяго скончыла курсы 60 чалавек: з іх 56 чал. атрымалі пасьведчаньні аб сканчэньні курсаў і 4 чал.—спраўкі аб праслуханьні імі лекцый на курсах.

Асноўная мэта курсаў—перакваліфікацыя судова-сьледчых працаўнікоў.

На курсах навучалася: 17 нарсудзьдзяў, 19 сакратароў судова-сьледчых органаў, 7 сьледчых і пракурораў; рэшта—17 чал.—юрыдычныя працаўнікі розных устаноў (СНК, Эканам. Нарады і інш.) і вылучэнцы. У ліку курсантаў—10 жанчын.

З 25-га сьнежня на курсах пачнуцца заняткі з 3-м наборам курсантаў.

Водгукі на карэспандэнцыі.

— На заметку „Мера Булаўскага“ (С. Б. № 57 ад 10-III—27 г.) справа па абвінавачваньню Булаўскага Алеся па 1 ч. 105 арт. КК накіравана ў Мен. акрсуд на спыненьне.

— Па допісу „У мядзьведжых бярлогах“ (С. Б. № 225 ад 4-X—27 г.) пракуратура Мазырск. акр. паведамляе, што скарга Шафарэнкаў аб аштрафаваньні іх за лесапарушэньне правяралася памоцнікам пракурора 2 вуч. і, з прычыны таго, што штраф зьнят ЦВК, а каштоўнасьць лесу ўзыскваецца правільна, скарга пакінута бяз выніку.

Што-ж датычыцца хабарніцтва лясьнічага Станкевіча, то аб гэтым вядзецца дазнаньне старэйшым сьледчым Мазырскай акругі.

— Па допісу „Вузорны адказ“ (С. Б. ад 21-IX—27 г.) зямля Гулы Апанаса ў в. Дукорка пастановай РЗК залічана ў зям. фонд.

— Па допісу „Пакінулі сялян без сена“ (С. Б. № 222 ад 30-IX—27 г.) Дрыбінскі РВК тлумачыць, што сяляне-арандатары сенажаці сваіх абавязкаў па дагавору не выканалі. Пагэтаму РВК за невыкананьне ўмовы перадаў справу на вырашэньне ў Аршанск. акр. зямельн. камісію, якая арэндную ўмову скасавала.

Гэту сенажаць улетку 1927 г. РВК у парадку земляўпарадкаваньня перадаў гр-вам тэй-жа в. Повас-Прыбужжа, але толькі тым, хто ня меў мінімальнай нормы зямлі. Заможная частка вёскі была гэтым незадаволена і напісала аб сваей «крыўдзе» ў газэту.

Паштовая скрынка.

Цітаву В. В. (Менск, Рабфак). Просьба зайсьці ў рэдакцыю для перагавораў па справе, якая датычыцца вас.

Лютарэвічу (Крупскі р.). На вашай заяве высьветлена, што ў гэтым годзе на вашу гаспадарку налічана с.-г. падатку 7 р. 62 кап.

Мацкевічу К. І. (Бягомльскі р.). Вылічэньне 10 проц. з вашай пазыкі зьяўляецца правільным.

Дапішчыку „Да“—просім паведаміць ваша сапраўднае прозьвішча і адрас, тады карэспандэнцыю „Ваганьні ў нацпалітыцы“ надрукуем.

Хвойка. Карэспандэнцыі „Гвалт над грамадзкай аграноміяй“.

Вася—„Пляменіка можна“ !

Свой. „Ганаровы сход“—накіраваны ў Аршанскі АВК.

Міхась В. Карэспандэнц. „Млын павінен прадаваць сялянам хлеб“ і

Праходзячы Міх. „Не аканомія“—накіраваны ў Пухавіцкі РВК.

Апавяшчэньні.

— У чацьвер, 8 сьнежня, роўна ў 7 гадз. вечара ў цэнтр. габінэце агітпрапработы (мал. зала кл. Карла Маркса) адбудзецца кансультацыя тав. Ігнатоўскага на тэму: „Пытаньні нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР на XI-м зьезьдзе КПБ“.

Запрашаюцца: цэнтральная група дакладчыкаў, сакратары і апоргі ячэек КПБ, партыйцы-работнікі культурных устаноў і вайсковыя партработнікі.

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 7-XII,—два кіно-сэансы ў 7 і 9 гадз. веч. Карціна—«Падзеньне дынастии Романовых». Усе месцы нумараваны.

ПЭДГАБІНЭТ.

— Сёньня, 7-XII, а 7 гадз. увечары—сход пэдолёгічнага гуртка.

Заняткі на тэму: „Увядзеньне ў пэдолёгію“.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

Вы можете одеть себя и свою семью без помощи портнихи, подписавшись на ежемесячный журнал „Домашняя Портниха“.
Каждый выпуск содержит 150 рисунков новейших фасонов, 20 выкроек, рукодельные работы, сист. курс кройки, шитья и пр.
ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1928 г.
Цена на год 10 р., 6 мес.—5 р. 50 к., 3 мес.—3 р.
При годовой подписке допускается рассрочка: 1-й взнос—4 р., 1 марта—3 р., и 1-го июня—3 руб.

ЕЖЕМЕС. МОДЫ ЖУРНАЛ.
Цена подписки на 1 год 16 р., 6 мес. —8 р. 50 к., 3 мес.—4 р. 50 к.
При годов. подписке допуск. рассрочка: 1-й взнос—6 р., 1-го марта—5 руб., и 1 июня—5 руб.
Наложен. платеж. подписка не принимается.
Отдельн. экземп. „Домашняя Портниха“ 1 р. 25 к.
„ „ „Моды“ 1 р. 75 к.
Наложен. платеж. на 20 коп. дороже.
Требования и деньги направлять:
Москва, 9. Тверская, Георгиевский пер., д. 2. Изд. „РЕКОРД“.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Спраўка Сачука Н. В., выд. Менскім Справдомам, кв. 126.

— Асабовае пасьведчаньне Сафаровіча І. Х., выд. Узьдзенскім РВК, кв. 127.

— Асабовая кніжка Пунтуса С. В., выд. Лагойскім РВК, кв. 128.

— Сяброўскі білет № 37, выд. ЦВК БССР, 2) сяброўскі білет, выд. Грэскім РВК, 3) сяброўскі білет, выд. Гразоўскім с-саветам, 4) сяброўскі білет № 21380, выд. саюзам с-г. лясных рабочых, 5) сяброўская кніжка касы ўзаемададамогі, 6) сяброўск. кніжка, выд. Старыцк. яч. АСО-Авіяхіма, 7) сяброўскі білет. выд. яч. „безбожніка“, 8) мандат. выд. райкомам саюза СГЛР на працы сярод батракоў на імя Дзямідовіча А, кв. 129, 130.

— Каапэрац. кніжка Руткоўскага У. О., выд. МЦРК, кв. 119.

— Прыпісн. кніжка данрызыўн. № 270 Марчанка Ц. К., выд. Любаньскім РВК, кв. 120.

— Асабовая кніжка № 2 Каліно Ф., выд. б. Бярэзаўскім ВВК, кв. 121.

— Сяброўскі білет, выд. саюзам працасьветы Александровіча А., кв. 123.

— Даведка аб здачы зямельнага надзелу, выд. упаўнаваж. хут. Нова-Мітрафанаўск, 2) Даведка аб поўнасьці, выд. упаўнаваж. хут. Нова-Мітрафанаўск. 3) Даведка аб сяброўстве спажыв. т-ва выд. старшыней Нова-Мітрафонаўскага спаж. т-ва, 4) Даведка аб беспрацоўнасьці, выд. МК станц. Мірскай, 5) Даведка аб месцы працы, выд. нач. 5-га вуч. Сев. Каўк. чыгункі на імя Мініча В. Е.

— Асабовае пасьведчаньне Янсон А. М., выд. Сухініцкай міліц.. Калужскай губ., кв. 118.

1 Дзяржаўная друкарня.